Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 21 1932 г. № 236 (4488)

Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Усе сілы і сродкі на штурм прарыву па зябліву. Да XV гадавіны Кастрычніка. В. РУДНІЦКІ — Культурнае будаўніцтва БССР да XV гадавіны Кастрычніка (2 стар.). АНЦІПЕНКА— Аб севазваротах жывёлагадоўчых саўгасаў (2 стар.). А. ОЛЬКЕС — Дняпра-дзьвінскі басэйн павінен стаць рэнтабельным (2 стар).

«Карэктывыр» Лёзьнянскага РК КП(б)Б (2 стар.).

Агляд замежнай прэсы—Крызіс і радыё (3 стар.).

БССР яшчэ павінна зазяблiць 1.116 тыс. га (1 стар.).

Шырока разгарнуць выраб тавараў шыр спажыву (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:
Уход Гендэрсона (4 стар.).
Барацьба ангельскіх беспрацоўных (4 ст).
Чарговае расправа з «Ротэ фанэ» (4 стар).
149 тыс. забастоўшчыкаў (4 стар.).

Усе сілы і сродкі на штурм прарыву па зябліву!

Яшчэ 16 жніўня СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязалі «Наркамзем, саўгастрэсы, Беларзіленьне, Трактарацэнтру, Калгасцэнтру, райкомы і райвыканкомы, на аснове правільнай арганізацыі працы, поўнага скарыстаньня трактараў і коняй, масавай палітычнай работы, сацыялістычнага і ўдарніцтва — скончыць зяблёвае ворыва па ўсёй БССР да 20 кастрычніка».

У тэй-жа пастанове **ЦК і СНК даручылі сакратарам РК і старшыням РВК пад іх ПЭРСАНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ забясьпечыць кантроль і канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва зяблёвай кампаніяй.** У пастанове было падкрэслена, што мерапрыемствы па зяблеве трэба ставіць, як адну з важнейшых гаспадарча-палітычных задач у сельскай гаспадарцы.

Са дня апублікаваньня пастановы прайшло больш двух месяцаў. Здавалася-б, што за такі вялікі тэрмін зямельна-калгасныя органы, раённыя партыйныя арганізацыі маглі поўнасьцю ажыцьцявіць дырэктывы партыі і ўраду, рапартаваць ЦК і СНК аб 100 проц. выкананьня плянаў зяблёва.

Але, на вялікі жаль, **дырэктыва ня выкананa. Ні** наркам земляробства, **ні** старшыня Калгасцэнтру, **ні** кіраўнік Беларзіленьня Трактарацэнтру ня могуць прыйсьці ў Цэнтральны Камітэт партыі і далажыць — зяблёва на 100 проц. Яны **не здолелі** за явіць, што з іх боку наладжан кантроль, канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва зяблевам. А гэтага яўрал і патрабаваў Цэнтральны Камітэт.

Кантроль, штодзённы кантроль і праверка выкананьня раней даных дырэктыў, канкрэтнае кіраўніцтва кожным раёнам паасобку, дапамога адстаючым вучасткам — вось большавіцкі стыль работы. Толькі пры такіх умовах можна было дасягнуць адпаведных посьпехаў на адным з важнейшых вучасткаў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, правесьці раньняе зяблёва, павысіць ураджайнасьць сацыялістычных палёў.

Аб чым-жа гавораць факты? Тэрміны прайшлі. Да 20 кастрычніка трэба было зазяблiць 1.500 тыс. га, з іх саўгасам — 150 тыс., калгасам — 825 тыс., адпаасобнікам — 525 тыс. га. Апошняя зводка НКЗБ сьведчыць аб яўнай загрозе зрыву 100 проц. выкананьня вытворчага заданьня, яна сьведчыць аб тым, што значная частка арганізацый не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з патрабаваньнем ЦК і СНК.

На 15 кастрычніка па БССР узарана толькі 384 тыс. га, або **25,6** проц. Перад МТС, калгасамі, саўгасамі і адпаасобнікамі стаіць задача — **зазяблiць яшчэ ¼ усёй плошчы,** якая вызначана плянам.

А плян зусім рэальны. Ён разьлічан на тыя магчымасьці, якія створаны ў апошнія гады ў сельскай гаспадарцы. Даволі прывесьці той факт, што сіламі МТС трэба ўзараць 40 проц. усёй вызначанай калгасам плошчы. На адзнаго каня прыпадае 3 га, на адну сілу (НР) трактара — 8 га. Нагрузка невялікая і можа быць поўнасьцю і ў самы кароткі тэрмін выкапана.

Пры ўмелым выкарыстаньні коняй і трактараў, пры правільнай арганізацыі работы калгасных вытворчых брыгад, кожная раённая партыйная арганізацыя даўно магла-б ня толькі выканаць, але і перавыканаць заданьне. Так і паступіў Тураўскі раён, які па 15 кастрычніка перавыканаў плян на 13 проц.

Ня зусім прыемны малюнак мы ўбачым пры аналізе ходу выкананьня зяблёва па сэктарах. Саўгасы сваё заданьне выканалі на 17,9 проц., калгасы на 19,4 проц., МТС на 3 проц., адпаасобнікі на 33,7 проц. Адстаюць больш за ўсіх саўгасы. Недалёка ад саўгасаў адышлі і МТС.

У чым сутнасьць адставаньня? Ніякіх аб'ектыўных прычын тут ня можа быць. Якраз у савецкіх гаспадарках ёсьць больш чым дзе-б там ні было магчымасьцяй для своечасовага выкананьня дырэктыў партыі. Саўгасы ў выстарчальнай колькасьці забясьпечаны трактарамі, с.-г. машынамі, конскай цягавай сілай.

Асноўнае заключаецца ў тым, што пават пасьля рэарганізацыі, апараты саўгастрэстаў, кіраўнікі паасобных саўгасаў яшчэ не перабудавалі сваёй работы, не падыйшлі пачыльна да вытворчасьці, слаба ажыцьцяўляюць у штодзённым жыцьці **6 гістарычных умоў тав. Сталіна.** Абязьлічка, бездапаказнасьць, бястурботнасьць аб матар'яльна-бытавых умовах рабочых — вось характэрнае становішча ў шмат якіх саўгасах.

Як-жа можна своечасова выкапаць плян зяблёва, калі, напрыклад, дырэктар Аршанскага сьвінаводтрэсту **Туніцкі** кіруе гаспадаркамі з габінэту, апарат ня ведае, дзе, у якой гаспадарцы, колькі ёсьць машын, як выкарыстоўваюцца трактары на зяблі і г. д. Як-жа МТС выкапаюць сваё заданьне, калі адзяленьне Трактарацэнтру ня ведае вытворчых паказальнікаў работы трактарнага парку. Так працавалі нельга. Пры такіх умовах ніколі не наладзіш канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва.

Лепшым паказальнікам сапраўды бальшавіцкай барацьбы за зяблёва, за павышэньне ўраджайнасьці могуць служыць перадавыя раёны: Тураўскі — 113,1 проц., Жыткавіцкі — 81,8 проц., Чырвона-Слабодзкі — 58,8 проц. Паўстае законнае пытаньне — чым-жа тлумачаць, што 25 раёнаў не дасягнулі нават 20 проц.? Чаму ня зыходзяць з торцай дошкі **Асьвейскі, Расонскі, Чашніцкі, Вушацкі, Бягомльскі, Прапойскі, Талачынскі, Крупскі, Уваравіцкі, Жлобінскі, Рэчыцкі і Веткаўскі** раёны?

Перш за ўсё трэба з усёй бальшавіцкай прастатой заявіць, **што раённыя камітэты партый адстаючых раёнаў не ўсьвядомілі ўсёй тэй вялізарнай ролі, якую адыгрывае зяблёва ў павышэньні ўраджайнасьці, у скарачэньні тэрмінаў веснавой сяўбы, у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.** Адсюль нежаданьне мабілізаваць масы на ўзмацненьне тэмпаў зяблёва, няўменьне расставіць сілы, слабая работа з брыгадамі, адсутнасьць сацыянаборніцтва і ўдарніцтва, ігнараваньне конскай цягі і г. д.

У выніку адставаньня значнай часткі раёнаў, трэцяя пяцідзёўка кастрычніка замест павышэньня дала зьніжэньне ўзаранай імі зяб плошчы на 8.000 га. Зазяблена ўсяго 64.000 га замест 72.000 у мінулую пяцідзёўку. Застаўся невялікі тэрмін, які можна скарыстаць для таго, каб паварстаць упушчаныя дні. Чацьвертая і пятая пяцідзёўкі кастрычніка павінны паказаць рэзкі ўздым тэмпаў. Зразумела, што пры самацёчных ва строях нежаданых вынікаў не дасягнеш.

Задача заключаецца ў тым, каб на працягу апошняй дэкады кастрычніка ні адзін трактарыст са сваёй машынай не прастойваў, каб трактар працаваў 20 гадзін у суткі, каб ён выконваў вызначаныя нормы. Трэба кінуць на зяблёва асноўную масу коняй, вызначыць брыгадам штодзённае вытворчае заданьне, кантраляваць якасьць ворыва.

У адстаючыя сельсаветы, калгасы і саўгасы трэба зараз-жа паслаць адказных работнікаў для арганізацыі работ па зяблеве. Арганізаваць сацыялістычную дапамогу перадавікоў, якія выканалі пляны, адстаючым гаспадаркам. Пры жаданьні, пры бальшавіцкай энэргіі можна ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца вялізарных посьпехаў на гэтым важнейшым адказнейшым вучастку барацьбы за ўраджай.

Правільнае і своечасовае авансаваньне калгаснікаў выключна па працаднёх, выкананьне дырэктывы калегіі НКЗ СССР аб павышэньні ацэнкі працадня трактарыстам на 50 проц., цырокае разгортваньне сацыянаборніцтва і ўдарніцтва ў брыгадах адыграе рашаючую ролю ў хутчэйшым выкананьні плану зяблёва. Усе магчымасьці, усе вагары павінны быць скарыстаны для канчатковай перамогі.

Мы яшчэ і яшчэ раз напамінаем пастанову ЦК і СНК ад 16 жніўня, у якой выразна сказана, што **«ацэнкаю здольнасьці партыйных і савецкіх арганізацый змагацца за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў будзе зьяўляцца тое, наколькі яны справяцца з выкананьнем пляну зяблёва».**

БССР ЯШЧЭ ПАВІННА ЗАЗЯБЛІЦЬ 1.116 ТЫС. ГА

Паводле паказальнікаў выкананьня плянаў зяблёва будзе ацэньвацца работа партыйных арганізацый у барацьбе за высокі ўраджай

СЛОВА ЗА БАЛЬШАВІКАМІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Выкананьне пляну зяблёва зьяўляецца адной з баявых задач барацьбы за высокі ўраджай.

Садова-гародная спэцыялізацыя раёну тым больш патрабуе поўнага і своечасовага выкананьня усіх якасных паказальнікаў пляну зяблёва.

Узараць 19.800 га зябі—праграма баявой дзейнасьці партыйна-савецкіх, калгасна-земельных арганізацый і ўсёй пралетарскай трамадзкасьці Віцебскага раёну.

Віцебскі раён—адзін з буйнейшых пралетарскіх цэнтраў БССР—мае ўсе магчымасьці поўнасьцю і ў тэрмін выканаць плян падняцьця зябі.

Ад Віцебску мы маем права патрабаваць узораў сапраўды баявой работы. Ён павінен быць вядучым раёнам. Аднак, у наяўнасьці буйнейшы прарыў. Ход выкананьня пляну зяблёва прымушае біць трывогу.

Па становішчы на 15 кастрычніка плян зяблёва па раёну выкананпа **14 проц.** Саўгасамі—на 15 проц., прыгарадньмі каапэрацыйнымі гаспадаркамі—на 11 проц., калгасамі—на 15 проц. і адпаасобнымі гаспадаркамі—на 12 проц.

Дзе-ж прычыны такога прарыву?

Прычыны ў людзях, прычыны ў кіраўніцтве. Загадчык гарадзкога зямельнага аддзелу знаходзіцца ў адпачынку і яго абавязкі выконвае **Гарадзецкі.**

Кіраўніцтва выкананьнем пляну зяблёва Гарадзецкі ажыцьцяўляе «наогул». Ён ня ведае сапраўднага становішча на мясцох, ня ведае канкрэтных вінаватых зрыву выкананьня пляну. Гарадзкі зямельны аддзел замест канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва абмежаваўся толькі зборам голых зводак.

Да гэтага часу на ворыва пад зяб не вылучана адпаведная колькасьць цягавай і людзкой сілы ў калгасах, паапгасах і саўгасах.

Недапушчальна адстаюць прыгарадныя гаспадарыі. Напрыклад, паапгас **імя Молатава** з 270 га па пляну, не ўзараў ні аднаго га. Ня лепш справа стаіць і ў паапгасах імя МОПР'у, **«Новы сьвет», Білова-Янаполь** і інш. Тут мы маем поўнае ігнараваньне агратэхнікі і ўпартае нежаданьне ўкараняць яе. Заводзкія арганізацыі гэтых прыгарадных гаспадарак не ўсьвядомілі важнасьці паляпшэньня рабочага забесьпячэньня праз арганізацыю і ўзорную пастаноўку справы ў прыгарадных гаспадарках.

Недапушчальна адстаюць і саўгасы. Фактычна саўгасы **Доўжа, Мазалава. Лужасна, Думіна** і саўгас міліцыі толькі распачынаюць ворыва пад зяб і то ня вылучыўшы адпаведнай колькасьці цягавай і людзкой сілы.

Буйнейшы калгас раёну—**імя Молатава,** Бабеніцкага сельсавету, таксама не распачаў зяблёва. Старшыня калгасу **Руднін,** відомы «очковтиратель», трапач, ініцыятар «вялікіх спраў» заўсёды запэўнае: «Усё гатовым, выканаем» і сваёй самападзейнасьцю Рудкін прывёў калгас да глыбокіх прарываў.

Ігнаруюць, упарта не жадаючы выконваць плян зябі, старшыні калгасаў «Чухвары»—**Тамашоў,** калгасу імя Сталіна—**Савіцкі,** калгасу «МОПР»—**Сокалаў,** калгасу «Прызыў»—**Тамашоў.** Па калгасах **Рудакоўскага** сельсавету замест 160 коняй і адпаведнай колькасьці людзей, на зябі працуюць ня больш 10-16 коняй.

Надзвычай дрэнна працуюць трактары МТС. За всрасень вытворчая праграма імі выканана толькі на 46 проц. Трактары працуюць з перабоямі, ня больш 10-12 гадзін у суткі і далёка ня выконваюць нормы выпрацоўкі. Начная работа трактараў не арганізавана.

Неабходна адзначыць, што на калгасах МТС на зяб зусім ня вылучана конская цягавая сіла. Працуюць толькі трактары. Наглядным прыкладам гэтага можа служыць **Селіцкі** вытворчы вучастак, які ўзначальваецца загадчыкам **Дзёміным** і аграномам **Эгліт,** дзе замест 1.050 га паднята зябі ўсяго толькі 189 га. Дзёмін недаацэньвае ролі каня і яго такой працы трактараў пляну зяблёва фактычна зрываецца.

У Баравулянскім вытворчым вучастку, які ўзначальваецца загадчыкам **Рамашка,** мы маем поўнае нежаданьне арганізаваць выкананьне пляну зябі. Рамашка лічыць лішняй працай араць на зяб.

Конская і людзкая сіла ў значнай меры вольная і не арганізавана на ворыва зябі.

Надзвычай дрэнна пастаўлена арганізацыя працы ў калгасах. Неправільна і нерацыянальна расстаўлены сілы.

Гарадзкі камітэт партыі не забясьпечыў апэрацыйнага кіраўніцтва разгортваньнем сапраўды бальшавіцкай барацьбы за зяб.

Стаўка на чарговасьць кампаній, няўменьне спалучыць барацьбу за зяб з выкананьнем збожжазагатовак, бульбазагатовак і інш. гаспадарча-палітычных задач—асабліва характэрна для Віцебшчыны.

Гарадзкім камітэтам партыі не забясьпечана перабудова партыйна-масавай і палітычна-выхаваўчай работы вясковай арганізацыі. Не забясьпечана перанясеньне дзяжару партыйна-масавай работы ў калгасную брыгаду. Яркім прыкладам гэтага можа служыць Бабеніцкая ячэйка КП(б)Б. Усе гэта і зьяўляецца прычынай адставаньня Віцебскага раёну ў выкананьні пляну зяблёва.

Пастанова ЦК і СНК СССР аб мерапрыемствах па ўзьняцьці ўраджайнасьці фактычна не даведзена да мас калгаснікаў і рабочых саўгасаў, яны не мабілізаваны на практычную яе рэалізацыю.

Бальшавікі Віцебшчыны павінны неадкладна ліквідаваць свае адставаньне і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну зяблёва.

В. Фесько.

Кожнаму аграному—канкрэтныя абавязкі

Адным са зьвеньняў, якія арганізуюць арганізацыю паляводчай часткі гаспадаркі і якія забясьпечваюць уздым ураджайнасьці, зьяўляецца ўвядзеньне севазвароту ва ўсіх саўгасах і калгасах БССР.

У пытаньні ўзьняцьця ўраджайнасьці, увядзеньне севазвароту павінна значна ўзрасьці роля агранома. Ён тут павінен выявіць сваю прыроду **арганізатара** сацыялістычных палёў.

Зямельна-каапэрацыйныя органы на мясцох у большасьці выкарыстоўвалі аграномаў у якасьці статыстыка, сакратара і ў лепшым выпадку, як агранома-дарадчыка і габінэтнага плянавіка.

Работа агранома ва ўмовах раённа-зямельных устаноў рацыянальна не выкарыстоўвалася ў сельскай гаспадарцы і калгаснай вытворчасьці. Да гэтага часу няма выразных установак цэнтральных зямельна-калгасных і прафсаюзных органаў, якія акрэсьліваюць правы і абавязкі агранома канкрэтна на кожным вытворчым вучастку.

Адсюль вялікае абязьлічка і невыкананьне 6 гістарычных умоў т. Сталіна. Адсюль цэлы рад момантаў нярэвільнага выкарыстоўваньня агратэхнэрсаналу, непасродна на сельска-гаспадарчай, саўгасна-калгаснай вытворчасьці.

Працу агранома трэба пераключыць на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па пытаньні ўзьняцьця ўраджайнасьці. Укараніць зьдзельшчыну ў рабоце агранома, з улікам яўных паказальнікаў. Асноўным паказальнікам зьдзельшчыны агранома палявога цэху павінна быць плошча саўгасаў і калгасаў, пераведзеная на ініцыятыўны севазваротаў. Уся сума аграмерапрыемстваў павінна быць зараз выкананa ў працы канкрэтнага кіраўніка агранома на вытворчым вучастку.

Дасьледча-навуковым установам трэба дапамагчы лізавым агра-работнікам у выразьненьні пытаньні ўзьняцьця ўраджайнасьці, бо вынікі іх працы на мясцох не атрымалі шырокага права стаць здабыткам шырокіх калгасных мас.

НКЗБ трэба хутка перагледзець схемы севазвароту, якія былі расасланы па раёнах яшчэ вясной.

У некаторых зіх дапа мала месца збожжавым культурам, адсутнічае глубін як на насеньне, так і на ўтаенасьне, зусім ня зьвернута ўвага на стварэньне штучных лапаў у севазвароце і наогул арганізацыю выкасаў.

Калгасныя масы настойліва патрабуюць упарадкаваць паляваю гаспадарку.

З прычыны неўпарадкаваньня поля, па тры гады бязьмежна сеюцца збожжавыя на збожжавых. У большасьці саўгасаў і калгасаў пляны ажыцьцяўляліся шляхам барацьбы за гэктары, але не за якасьць. У выніку — паміж колькасьцю і якасьцю вялікі разрыў. На ліквідацыю гэтага разрыву на павышэньне ўраджайнасьці мы, агрономы і павінны накіраваць усе свае здольнасьці, усю сваю энэргію.

Аграном ВАСІЛЬЛЕЎ.

М. Крупкі.

ДА XV ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

З вялізарнейшымі сусьветна-гістарычнымі вынікамі прыходзіць Савецкі саюз да пятнаццацігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. СССР стаў краінай буйнай індустрыі, краінай самага буйнага ў сьвеце зямляробства.

Яшчэ ў 1923 годзе, у адказе мешчанку Суханаву Ленін пісаў: «Калі для стварэньня сацыялізму патрэбен пэўны ўзровень культуры (хаця ніхто ня можа сказаць, які гэты пэўны «ўзровень культуры»), то чаму нам шельга пачаць спачатку заваяваньне рэвалюцыйным шляхам прадпасылак для гэтага поўнага ўзроўню, а **потым** ужо, на аснове рабоча-сялянскай улады і савецкага ладу, рушыцца даганяць другія народы». (Т. XXVII, стар. 400).

Пятнаццацігадовая гісторыя пралетарскай дыктатуры ў СССР даказала правільнасьць ленінскага прагнозу. СССР, атрымаўшы буйнейшыя перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, канчаткова ўмацаваўся на новым сацыялістычным шляху. Перамогу сацыялізму ў СССР можна лічыць забясьпечанай. Іменна савецкі лад, іменна дыктатура пралетарыяту і яе экаламічная сыстэма забясьпечылі рашаючыя перамогі сацыялізму ў першай пяцігодцы. Гэтыя перамогі далі нам магчымасьць паставіць задачу канчатковай ліквідацыі клясаў і пабудаваньня сацыялістычнага грамадзтва ў СССР у другую пяцігодку.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ўстанавіла дыктатуру пралетарыяту, якая «ёсьць клясавы саюз пралетарыяту і працоўных мас сялянства для зьвяржэньня капіталу, для канчатковай перамогі сацыялізму, пры ўмове, што кіруючай сілай гэтага саюзу зьяўляецца пралетарыят» (Сталін, прадмова да кнігі «На путях к Октябрю»).

На працягу прайшоўшых пятнаццаці год партыя мацавала і замацоўвала дыктатуру пралетарыяту, мацавала і замацоўвала саюз пралетарыяту і сялянства. На аснове гэтага саюзу СССР атрымаў гігантскія перамогі, на аснове гэтага саюзу былі створаны прадпасылкі для пераходу працоўнага сялянства на калектыўныя формы гаспадаркі.

А гэта ў сваю чаргу «ўмацоўвае змычку, даючы ёй новую вытворчую базу... Руйнуецца і ператвараецца ў нішто апошняя надзея капіталістаў усіх краін, якія мараць аб аднаўленьні капіталізму ў СССР,—«сьвяшчэнны прынцып прыватнай уласнасьці». Сяляне, разглядаемыя імі, як матар'ял, які служыць гнэем для капіталізму, масамі накідаюць хвалёны сьцяг «прыватнай уласнасьці» і пераходзяць на рэйкі калектывізму, на рэйкі сацыялізму. Руйнуецца апошняя надзея на аднаўленьне капіталізму» (Сталін, «Год великого перелома»).

Пастановы апошняга (верасьнёўскага) пленуму ЦК УсеКП(б), як і папярэднія партыйныя пастановы, накіраваны на тое, каб яшчэ больш умацоўваць саюз з сялянствам. Яны, гэтыя пастановы—даюць разгорнутую праграму для далейшага прасоўваньня праграму для далейшага прасоўваньня перад да пераможнага завяршэньня першай пяцігодкі і да барацьбы за другую пяцігодку.

Барацьба за ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў—вось асноўны зьмест усёй нашай падрыхтоўчай работы да пятнаццацігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

«Зьвязда» разам з ЦСПСБ, упаўнаркамцяжпрамам, упаўнаркамлесам, наркаматам лёгкай прамысловасьці і прамкаапэрацыяй абвясьцілі ўсебеларускі мітынг-пераклічку прадпрыемстваў і прамарцеляй. Пераклічка павінна мабілізаваць шырокія масы рабочых, падняць іх актыўнасьць у барацьбе за лепшы уцільцэх, брыгаду і арцель, якія выпускаюць прадметы шырокага ўжытку.

У гэты мітынг-пераклічку ўжо ўцягнулася рад прадпрыемстваў. Уцільцэх віцебскага шчаціннага камбінату дабіўся рэзкага пералому ў выкананьні вытворчай праграмы. Пачынаюць варушыцца і барысаўскія прадпрыемствы. Але на радзе прадпрыемстваў уцільцэхі ўсё яшчэ дрэнна працуюць (завод імя Сталіна, «Рухавік рэвалюцыі», «Пралетары» і інш.).

Баявая задача партыйных, прафсыяльных, гаспадарчых арганізацый і друку скарыстаць мітынг-пераклічку, як адзін з вагароў па павялічэньні выпуску тавараў шырокага ўжытку. Гэта будзе лепшым падарункам шырокіх рабочых мас да пятнаццацігодзьдзя Кастрычніка.

Другой надзвычай важнай задачай у падрыхтоўцы да XV гадавіны зьяўляецца барацьба за ўзьняцьце ўраджайнасьці. «Пастановы аб ураджайнасьці і аб зямлякарыстаньні калгасаў маюць тое буйнейшае значэньне, што яны па-першае, замацоўваюць нэпы дасягненьні ў галіне сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Па-другое, яны ўказваюць шляхі далейшага яе ўздыму, павялічэньне масы сельска-гаспадарчай прадукцыі» (Кагановіч).

Калгасьнікі калгасу імя Пакроўскага (Дзяржынскі раён), пачаўшы паход за павышэньне ўраджайнасьці, у спэцыяльным лісьце да ўсіх калгаснікаў, рабочых саўгасаў і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі БССР («Зьвязда» ад 13 кастрычніка) высунулі цэлы рад каштоўных прапаноў.

Матар'ял, зьмешчаны за апошнія дні ў «Зьвязьдзе», сьведчыць аб тым, што ў радзе раёнаў (Чавускі, Лёзьнянскі, Рэчыцкі і інш.) не падхапілі ліста калгасу імя Пакроўскага, не ўсьвядомілі ўсёй палітычнай і гаспадарчай важнасьці задачы павышэньня ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

Кожны калгас, кожны саўгас павінен прысьці да XV гадавіны Кастрычніка з канкрэтнымі мерапрыемствамі па павышэньні ўраджайнасьці.

Справа гонару кожнага калгасу і саўгасу—сустрэць XV гадавіну поўным выкананьнем плянаў уборкі, загатоўкі і адгрузкі бульбы. Задача раённых газэт і ўсяго пісьменнага друку—арганізаваць чырвоныя эшалёны з бульбай для пралетараў гораду Леніна ў гонар XV гадавіны.

Канкрэтнымі бальшавіцкімі справамі, павышэньнем тэмпаў на ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі мы адзначым XV гадавіну вялікай пралетарскай рэвалюцыі, расчысьціўшай шлях нячуванай у гісторыі чалавецтва творчасьці шырокіх працоўных мас.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

РАДЫЁ-ПЕРАДАЧЫ Ў КАСТРЫЧНІЦКІЯ ДНІ

МАСКВА, 20 (ТАСС). Пры ўсесаюзным камітэце радыёвяшчэньня створан штаб па арганізацыі радыёвяшчаньня ў прадкастрычніцкія і кастрычніцкія дні. 6 лістапада па ўсім Савецкім саюзе будзе трансьляваццца ўрачыстае пасяджэньне ў Вялікім тэатры. Учох з 6 на 7 будзе дан вялікі кастрычніцкі канцэрт. У 6 гадзін раніцы 7 лістапада пачнецца вялікая радыёперадача. У 9 гадзін раніцы пачнецца перадача параду і дэманстрацыі на Красным пляцы. Пляцы Ленінграду, Харкаву, Менску, Тыфлісу, Баку, Растова, Варонежу і інш. гарадоў будуць уключаны ва ўсесаюзную радыёперадачу для абмену прывітаньнямі з Масквай. Увечары праз радыё будзе перадавацца спэцыяльная мастацкая праграма, у якой прымуць удзел лепшыя эстраднікі. У гэты-ж дзень будзе перадавацца перароблены Серафімовічам для радыё «Жалезны паток». Усе перадачы праводзяцца праз радыё-станцыі «Камінтэрн» і УсеЦСПС праз вопытны перадатчык.

ДАМЫ ДЛЯ ЎДАРНІКАЎ

МАСКВА, 20 (ТАСС). ЦК рабочых мэталюргаў стварае жыльлёвы фонд імя 15-й гадавіны Кастрычніка. Дамы будуць будавацца на Паўночным Каўказе, Данбасе, у Дняпрапятроўску, Магнітагорску і на Ўрале. Усе дамы будуць заселены ўдарнікамі мэталюргічных заводаў.

* * *

МАСКВА. (ТАСС). Да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выйдзе рад навуковых прац і зборнікаў, якія падводзяць вынікі паасобных бакоў грамадзка-палітычнага, гаспадарчага, культурнага, навуковага жыцьця СССР за 15 год.

НОВАЕ МЕСЦАНАРАДЖЭНЬНЕ НАФТЫ

АШХАБАД, 20 (ТАСС). У 250 кілёмэтрах да паўночнага захаду ад Карабугаскай затокі выкрыта месцанараджэньне нафты. Нафта фантануе.

На Карабугаскіх промыслах закладзен вопытны садовы завод, магутнасьцю 5 тыс. тон прадукцыі ў год.

СЕВАЗВАРОТ НА АРШАНШЧЫНЕ УВЕДЗЕН НА... ПАПЕРЫ

ВОРША. (Наш спэцкар.). Аршанскі раён калектывізаваны на 60 проц. Ёсьць 17 буйных саўгасаў. Гэта дае вялізарныя магчымасьці для карэннага павароту ў напрамку павышэньня ўраджайнасьці.

Аднак на Аршаншчыне да сёнешняга дня існуюць пагардлівыя адносіны да агратэхнікі, да элемэнтарных агратэхнічных мерапрыемстваў з боку зямельна-калгасных органаў. У гэтым уся прычына нездавальняючага ўраджаю ў паасобных саўгасах і калгасах.

Зяблёва—адно з важнейшых аграмерапрыемстваў у павышэньні ўраджайнасьці. З 20 кастрычніка па раёне трэба было зазяблiць 40.500 га. Ня справілася аршанская партарганізацыя з пастаўленай перад ёю задачай. На 15 кастрычніка плян выканан толькі на 34,9 проц. Праўда, Аршаншчына ідзе наперадзе па паўночнай зоне, але-ж гэта ні ў якім разе не дае поваду для заспакаеньня. Тэмпы зяблёва нездавальняючыя. Дырэктывы партыі аб своечасовым ворыва да 20 кастрычніка ня выкананы.

Возьмем ажыцьцяўленьне іншых агратэхнічных мерапрыемстваў. На пляну трэба было правесьці радковы пасеў на плошчы ў 9.685 га, вапнаваньне на плошчы 590 га. Ні загадчык райза **Жылінка,** ні райаграном **Лісаў** ня ведаюць, што зроблена ў гэтым напрамку, як намечаныя мерапрыемствы ажыцьцёўлены калгасамі і саўгасамі.

Пры наяўнасьці 26 трактараў, пры правільным выкарыстаньні коняй як плян зяблёва, так і іншыя аленьня гаспадарчыя кампаніі можна было выканаць у вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны. Але тут якраз сказалася няўменьне райкалгассаюзу, дырэкцыі МТС правільна арганізаваць работу, умела расставіць сілы.

Для таго, каб атрымаць высокі ўраджай, трэба ажыцьцявіць цэлую сыстэму агратэхнічных мерапрыемстваў. Гэтага ня ўлічылі калгасна-зямельныя органы Аршаншчыны.

Справа ў тым, што ўвядзеньне севазвароту цесна ўвязваецца з правільнай арганізацыяй работ у гаспадарцы. Райкалгассаюз і МТС не ўхапіліся за асноўнае зьвяно—арганізацыю пастаянных вытворчых брыгад у калгасах. У большасьці калгасаў абязьлічаны зямельныя вучасткі, ня складзены пастаянныя брыгады, у сельсаветах ня вылучаны пэўныя работнікі, якія-б несьлі адказнасьць за адпаведны вучастак у галіне агратэхнікі.

У выніку такой работы **севазвароты на Аршаншчыне ўведзены толькі на паперы.** Паводле вестак райза, з 17 саўгасаў 15 пераведзена на севазварот. Калгасаў пераведзена на севазварот 45. Лічба, як быццам не малая. Аднак, лічба застаецца лічбай.

Аграном з каморнікам, разьбіўшы ў калгасе плошчу на палі, склаўшы пераходную табліцу севазвароту, пасьля гэтага супакоіліся і не правяралі, ці ажыцьцяўляецца на практыцы ўведзены севазварот.

Аграспэцыялісты вельмі часта скарыстоўваюцца не па прызначэньні. Яны займаюцца канцылярскай работай, статыстыкай, але толькі ня пытаньнямі агратэхнікі.

Аграхэмлябараторыя да сёнешняга дня бясспрытульная. Аграхэмік скарыстоўваецца на розных работах, у той час, як да сёнешняга дня ў раёне няма глебавай карты, не праведзена яшчэ праца па высьвятленьні патрэбы таго ці іншага вучастку глебы ў азоце і мінэральных угнаеньнях.

На Аршаншчыне з прычыны нізкасьці глебы кожны год вымакаюць тысячы гэктараў азімых і яравых пасеваў. Калі агранеліяратарам МТС тав. **Стрэльскім** была ўпесена прапанова адрамантаваць знойдзены канавакапальнік «ПААВА», дык дырэкцыяй МТС гэта прапанова была адхілена. Усё-ж такі па ініцыятыве тав. Стрэльскага і на яго ўласныя сродкі канавакапальнік быў адрамантаваны і ў верасьні месяцы выкарыстан на працы.

На сёнешні дзень канавакапальнік пры выкарыстаньні трактарнай цягі дае вялізарную эфэктыўнасьць у рабоце на асушаньні нізінных месц. Канавамі ўжо ахоплена каля 500 гэкт. пасеўнай плошчы. Згодна расцэнак адзін кілёмэтр такой канавы абыходзіцца ў 22 руб., у той час, калі ўручную затрачваецца эдольні тысячы рабочых дзён.

Усе факты гавораць самі за сябе. Зямельна-калгасныя органы Аршаншчыны не выкарыстоўваюць усіх магчымасьцяй у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

В. Александровіч.



КАНАВАКАПАЛЬНІК «ПААВА». У дзень ім выкопваецца 3-4 клм. каналу глыбінёю ў 55—65 сант., паверху—1 мэтр. і па-дну —10 см.

Гэты спосаб мэліярацыі захоўвае азімі і яравыя пасевы ад вымачкі.



Панарама будаўніцтва сталеліцейнага цэху Краматорскага машынабудаўнічага заводу

„КАРЭКТЫВЫ“ ЛЁЗЬНЯНСКАГА РК КП(б)Б

ЛЕЗНА. (Наш кар.)

Нельга сказаць, што летась по гаварылі аб партвучобе ў Лёзьнянскім раёне. Гаварылі часта, многа, сур'ёзна. Але... словы заставаліся словамі. Канец партнавучальнага году сышоў, як гавораць у раёне, на нішто. Ня было ні выпускаў, ні нават падагульненьня вынікаў: ня было чаго падагульняць.

Тав. **Барташ**, які ў гэтым годзе кіруе партвучобай, лічыць, што ня было выстарчальнай увагі партвучобе як з боку ячэек, так і РК КП(б)Б. Ды і якая-ж тут увага, калі ў раёне ня было яснага ўяўленьня аб колькасьці школ, гурткоў; весткі даваліся наабум, са столі. З гэтым трэба згадзіцца.

Які зрух, якія дасягненьні прынёс пачатак новага партнавучальнага году?

Паводле дырэктыў ЦК КП(б)Б, сетка партыйных школ і гурткоў павінна быць пабудавана так: **кандыдацкая школа**, праз якую трэба ахапіць вучобай кандыдатаў партыі, маладых і слаба палітычна-разьвітых членаў партыі і беспартыйны актыў; **першапачатковая 6-месячная школа** для больш палітычна-разьвітых таварышоў—членаў партыі, кандыдатаў і беспартыйных; **аднагадовая саўпартшкола і марксыцка-ленінскі гурток** па тыпу вячэрняга камвузу.

Лёзьнянскі РК КП(б)Б не палічыў нават патрэбным дакладна выканаць дырэктывы партыі, ён **унёс свае «карэктывы»**.

Кандыдацкія школы зусім скасаваны, нібы таму, што іх праграма мала адрозьніваецца ад першапачатковых шасьцімесячных партшкол. «У кандыдацкай школе трэба распрацоўваць статут і праграму партыі, дык гэта можна ўключыць і ў праграму першапачатковай школы»,—так разважалі таварышы з Лёзьнянскага РК КП(б)Б. Паразмылі і зрабілі: **дзьве школы зьлілі ў адну.**

У Лёзьнянскім раёне чамусьці палічылі, што няма падстаў разьбіваць людзей на розныя групы, чамусьці знайшлі, што ўзровень учора прынятых у партыю рабочых і калгасьнікаў адпавядае з тымі, якія некалькі год працуюць у радах партыі і хоць дрэнна, але вучыліся. Па меншай меры, дзіўныя разважаньні, дзіўныя «карэктывы».

Трэба было арганізаваць і аднагадовыя саўпартшколы. Трэба, але... не арганізавалі. І тут «на свой капыл» абярнулі дырэктыву партыі. «Навошта аднагадовую? Навошта арганізоўваць многа школ? Арганізуем адну ў раёне і не аднагадовую, а шасьцімесячную. Менш выдаткаў. Пры тым, наколькі за год кантынгент слухачоў або вязкова (?) зьменіцца, ніхто і ніколі (?) ня скончыць школы»—так парашылі ў адпосінах да аднагадовых саўпартшкол. Для ёскі замест саўпартшкол, прапанавалі шасьцімесячныя палітгурткі «па тыпу школ». За шэсьць месяцаў хоць лопні, а павінен прайсьці тое, што ЦК КП(б)Б вызначыў распрацаваць за год. Праграма-ж, паводле слоў тав. **Барташа**, не скарочана: павялічана колькасьць дзён заняткаў і колькасьць гадзін.

Такія «карэктывы» ўнёс Лёзьнянскі РК КП(б)Б у дырэктывы ЦК КП(б)Б аб структуры сеткі партшкол. Ня прыходзіцца даказваць, што гэтыя свавольныя і беспадстаўныя зьмены зьяўляюцца простым парушэньнем указаньняў партыі.

Як-жа ўкамплектаваны ўжо арганізаваныя школы? Хто імі кіруе? Як праходзяць заняткі?

Нельга даць дакладнага адказу на гэта пытаньне, бо ў раёне аб гэтым ніхто добра ня ведае. Паперовыя зводкі маюць сухі язык і мала аб чым расказуць. Заняткі пачаліся нядаўна, з 1-га кастрычніка, нарады сялкаць не пасьпелі. Вось і невядома.

Аднак і тыя весткі (сухія, паперовыя), якія ёсьць у РК КП(б)Б, усё-тое могуць сказаць пры ўважлівым іх аналізе. Першапачатковых шасьцімесячных партшкол, аб'яднаных з кандыдацкімі школамі, трэба было адкрыць 50 і адкрыта 50. Тэрмін «адкрыцьця» іх у Лёзьнянскім раёне, разумеецца, сваязаслівы: адкрыты на паперы, бо ўкамплектаваны яшчэ толькі 23 школы, з агульнай колькасьцю слухачоў у 501 чалавек.

Шасьцімесячных палітгурткоў арганізавана 19, укамплектаваны-ж толькі 5, з агульнай колькасьцю слухачоў 83 чал.

У саўпартшколу пакуль што запісалася 17 чалавек, мяркуюць, што запішацца яшчэ столькі, а мо і больш. Заняткі пачнуцца з 20 кастрычніка. З 20 кастрычніка павінен пачаць работу і марксыцка-ленінскі гурток па тыпу вячэрняга камвузу. Сьпіс у РК КП(б)Б складзен, у сьпісе вызначана, хто павінен наведваць гэты гурток, хоць гэтыя таварышы аб сьпісе і ня ведаюць. Абяцаюць выпісаць спэцыяльныя паведамленьні.

Трэба адзначыць, што пагэтуль няма яшчэ і праграм. На падставе дасланых схэм праграмы на месцы, у РК КП(б)Б прабуюць распрацоўваць сваю праграму, але гэта самацужніцтва можа прывесьці да дрэнных вынікаў. Дрэнна і з літаратурай: яе або няма зусім па некаторых пытаньнях, або вельмі мала. Цяга-ж да вучобы ёсьць вялікая, **вучобу трэба арганізаваць.**

А арганізацыйная работа пастаўлена дрэнна. Ужо зараз дапускаюцца зрывы заняткаў. У **Веляшкоўскім**, напрыклад, сельсавеце 6 кастрычніка **сарваліся заняткі**, бо быў пленум сельсавету.

Не пасьпеўшы пачаць заняткі, ужо **мяняюцца кіраўнікі.** Кіраўніка палітгуртка пры **Гладанскім** сельсавеце тав. **Шэндзелеву** перавялі на пасаду брыгадзіра фабрыкі імя **КАРЛА МАРКСА, Высачанскага** сельсавету. Перавялі 6 кастрычніка, а яе і 13 кастрычніка ў РК КП(б)Б лічаць кіраўніком палітгуртка.

Такая «апэрацыйнасьць» у кіраўніцтве палітвучобай ня можа прывесьці да іншых вынікаў, чым у мінулым годзе. Згадзіцца за поўнае ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б аб арганізацыі партвучобы — задача лёзьнянскай партарганізацыі. **РК КП(б)Б павінен неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі.**

АБ СЕВАЗВАРОТАХ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ*)

Галоўным пытаньнем у павышэньні якасьці работы жывёлагадоўчых саўгасаў і ў барацьбе за высокі ўраджай зьяўляецца пытаньне аб устанаўленьні севазвароту.

Пры складаньні севазвароту трэба выходзіць з задаваньняў народна-гаспадарчага пляну, паставіць сваёй мэтай стварыць моцную кармовую базу для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

А для гэтага неабходна плянава разьмяшчаць на палёх саўгасаў культуры, якія патрэбны для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня гаспадарак.

Выходзячы з агульных плянавых заданьняў, севазварот трэба арганізаваць для кожнага саўгасу, прымаючы пад увагу прыродныя ўмовы і спэцыялізацыю раёну, дзе знаходзіцца саўгас.

Севазварот павінен адказваць запатрабаваньням па павышэньні ўраджайнасьці і забясьпечыць умовы барацьбы з сямецьцёвымі травамі.

Пры складаньні севазвароту неабходна ўвязаць і забясьпечыць тэхнічныя і арганізацыйныя магчымасьці выкананьня ў гаспадарцы ўсіх плянавых работ у кароткі тэрмін (весняная сяўба, уборачная кампанія, зяблева, сіласаваньне і г. д.).

У залежнасьці ад асобных запатрабаваньняў культур, што ўводзяцца ў севазварот, неабходна ўстанавіць аднаведныя прыёмы апрацоўкі і догляду за расьлінамі, якія адпавядаюць умовам агратэхнікі.

Не аўладаўшы тэхнікай вытворчасьці, не магчыма дасягнуць высокай прадукцыйнасьці працы і скарыстаць усе перавагі буйнай сацыялістычнай гаспадаркі.

У тэжным севазвароце неабходна разьлічыць пачатак і канец. Большай часткай пачаткам севазвароту бяруць папар заняты, які патрабуе затрат больш, чым іншыя культуры.

Севазварот звычайна заканчваецца менш патрабоўнымі расьлінамі (аўсом, зборным клінам) гэта будзе канец севазвароту, пасьля чаго пачынаецца севазварот спачатку.

Існуючыя севазвароты ў савецкіх гаспадарках у большай колькасьці не адпавядаюць напрамкам спэцыялізацыі апошніх. Гэтыя севазвароты маюць вялікі процант збожжавых культур і зусім малы процант траў, кораньплодаў, сіласных культур, без якіх немагчыма стварыць пастаянную кармовую базу для жывёлагадоўчых саўгасаў.

Тэхніка-прамысловыя гаспадаркі таксама ня маюць аднаведных севазваротаў. У тэхнічна-прамысловых гаспадарках бульба займае малы процант (каля 10—13 проц.), а ў садова-гародных гаспадарках процант пад гароднімі культурамі зусім нязначны.

Севазвароты ў савецкіх гаспадарках павінны адказваць народна-гаспадарчаму заданьню, матворчаму напрамку і спэцыялізацыі, забясьпечваючы павышэньне ўраджайнасьці.

У жывёлагадоўчых гаспадарках севазварот павінны поўнасьцю забясьпечыць жывёлу кораньплодамі, сіласам, грубымі кармамі і канцэнтраванымі да 75 проц., бо канцэнтраваны корм больш траспартабельны ў параўнаньні з грубымі кармамі і можа лепш папаўняцца завозным парадкам.

Харчаваньне жывёлы камбінавымі кармамі таксама трэба ўлічваць і стаць на шлях пабудовы ў жывёлагадоўчых саўгасах камбінатных заводаў.

Пытаньні аб севазваротах ва ўмовах БССР для савецкіх гаспадарак як дасьледчыкі, так і гаспадарчымі ўстановамі амальшто не распрацаваны і не праверены на практыцы. Да гэтага часу савецкія гаспадаркі ідуць самацёкам, не надаюць таго вялікага значэньня чаргаваньню культуры, якое яно павінна мець па сутнасьці справы.

Толькі вельмі нязначная частка жывёлагадоўчых саўгасаў пачала дастасоўваць севазвароты, якія хоць да некаторай ступені забясьпечваюць умовы спэцыялізацыі саўгасаў, спрыяюць стварэньню пастаяннай кармовай базы.

Надаючы вялікае значэньне ўвядзеньню севазвароту, высоўваюцца на абгаварэньне мас, асабліва спэцыялістаў, наступныя севазвароты ў жывёлагадоўчых саўгасах БССР:

ПЕРШЫ ВАРЫЯНТ. 1. Папар заняты. 2. Азімыя з падсевам сэрадэлы. 3. Кораньплоды і гароднія культуры. 4. Сіласныя культуры. 5. Бульба і бабовыя на насеньне. 6. Ярына з падсевам шматгадовых траў. 7. Травы 1-га году. 8. Травы 2-га году. 9. Травы 3-га году. 10. Травы 4-га году.

У гэтым севазвароце суадносіны культур вызначаюцца наступныя: 1. Збожжавых азімых — 10 проц. 2. Яравых — 10 проц. 3. Бабовых на насеньне — 5 проц. 4. Сідэральных — 2 проц. 5. Бульбы—5 проц. 6. Кораньплодаў — 8 проц. 7. Сіласных — 7 проц. 8. Шматгадовых траў — 40 проц. 9. Аднагадовых траў—10 проц. 10. Гароднія і інш.—3 проц.

Пры гэтым чаргаваньні і суадносінах культур жывёла будзе на 100 проц. задаволена грубымі і надзяністымі кармамі і часткова канцэнтраванымі.

ДРУГІ ВАРЫЯНТ севазвароту з падзелам жа прысядзібны і адцеглы. а) Прысядзібны. 1. Кораньплоды і гароднія культуры. 2. Сіласныя культуры. 3. Бульба. 4. Ярына і зборныя культуры. в) **Адцеглы севазварот:** 1. Азімае з падсевам сэрадэлы. 2. Бульба. 3. Ярына з падсевам шматгадовых траў. 4. Травы 1 году. 5. Травы 2 году. 6. Травы 3 году. 7. Травы 4 году. 8. Травы 5 году.

У гэтым севазвароце пры дастатковай наяўнасьці натуральных выганаў і сенажацяй, можна 9-га поля траў не практыкаваць. Яго лепш ужываць там, дзе ёсьць тэхнікадрыемствы (бовар ці кухмальня).

ТРЭЦІ ВАРЫЯНТ севазвароту. 1. Папар заняты. 2. Азімыя з падсевам сэрадэлы. 3. Кораньплоды. 4. Сіласныя і бульба. 5. Ярына з падсевам шматгадовых траў. 6. Травы 1 году. 7. Травы 2 году. 8. Травы 3 году.

Севазвароты 1 2 і 3 варыянтаў пажадана ўводзіць у тых гаспадарках, дзе глеба сугліністая і наогул больш ураджайная.

ЧАЦЬВЕРТЫ ВАРЫЯНТ севазвароту для тых гаспадарак, дзе глеба супясчаная. 1. Лубін на ўгнаеньне. 2. Жыта. 3. Ярына з падсевам шматгадовых траў. 4. Травы 1 году. 5. Травы 2 году. 6. Травы 3 году 7. Травы 4 году. 8. Травы 5 году.

Пры гэтым севазвароце пад агароднія культуры і кораньплоды вызначаецца асобная частка пахаці.

ПЯТЫ ВАРЫЯНТ севазвароту для мясчаных глеб. 1. Папар лубінавы. 2. Жыта з падсевам сэрадэлы. 3. Лубін на ўгнаеньне. 4. Бульба. 5. Лубін па насеньне. 6. Сэрадэла. 7. Ярына.

Прыведзеныя тыпы севазвароту для жывёлагадоўчых саўгасаў зьяўляюцца толькі прыкладам для той ці іншай жывёлагадоўчай гаспадаркі. **Увядзеньне-ж больш дасканалага севазвароту, які-б адказваў усім плянавым заданьням і інш. умовам, павінен складацца непасрэдна на месцы ў гаспадарцы пры актыўным абгаварэньні мясцовых, арганізацый і пры дапамозе спэцыялістаў.**

Т. Анціпенка.

*) У парадку пастаноўкі пытаньня.

ДНЕПРА-ДЗЬВІНСКІ БАСЭЙН ПАВІНЕН СТАЦЬ РЭНТАБЕЛЬНЫМ

У БССР, як і ва ўсім Савецкім саюзе, адбываецца вялізарнае будаўніцтва, якое з году ў год расьце шпаркімі бальшавіцкімі тампамі.

Калі параўнаць рост будаўнічай прадукцыі ў 1931 г. супроць 1930 г., дык атрымаецца: па вапне павялічэньне на 367 проц., на цэгле—на 219 проц., чарапіцы—на 473 проц., піламатар'ялах—145 проц. і фасфарытах—151 проц. у 1932 г. рост супроць 1931 г. складае: па будматар'ялах 212 проц., па мэталяпрацоўчай прамысловасьці — 138 проц., па тарфяной — 308 проц. і г. д.

Характэрна, што будаўніцтва ў большай частцы адбываецца на берагах рэк, бо гэтаму спрыяюць сырцовая база пры рэчных раёнах.

На раце Барозіна пабудован Бабруйскі лесакамбінат з праграмай перапрацоўкі больш 200 тыс. кбм. лесаматар'ялаў; буйныя лесазаводы пабудаваны на Дняпры і Заходняй Дзьвіне, мясакамбінаты і элеватары на чыгуначных і водных пунктах — Магілеў, Гомель, Ворша і т. д.

Ля р. Сож вырас буйны фасфарытны завод, які спажыве ўжо ў 1932 г. 260 тыс. тон мясцовага сырцу, і цэмэнтны завод з прадукцыяй каля 1 млн. бочак цэмэнту ў год.

Па р. Дняпро будуецца топлівая фабрыка, на р. Мяжы — буйны аграрна-індустрыяльны камбінат.

Зусім зьмяняецца выгляд сельскай гаспадаркі. Разьвіваецца жывёлагадоўля, ільняная, малочная і садова-гародная гаспадаркі.

Водныя шляхі БССР адыгрываюць значную ролю ў перавозцы масавых грузаў і ў поўнай ступені спрыяюць пасяраньню гаспадарчага росту, асабліва тых раёнаў, якія цераюць ад поўнага бездарожжа (Палесьсе, Падсожа).

Рэкі БССР маюць па тольки мясцовае значэньне, але яны зьяўляюцца ў большай ступені прадметам транзітнай дняпроўскай магістралі і падзямнымі шляхамі, якія даюць выхад прадукцыі БССР і Заходняй вобласьці на поўдзень, у Данбас і Чорнае мора.

Разбуйненьне дняпроўскага параходзтва ў 1930 г. і вылучэньне новага кіраўніцтва Днепра-Дзьвінскага рэчнага транспарту ў Беларусі, непасрэдна зьвязанага з мясцовай гаспадаркай, мела на мэце шырока разьвіць закінутыя раней рэчныя вучасткі ў БССР.

Трэба сказаць, што пры вылучэньні тэрыторыі Днепра-Дзьвінскага басэйну было дапушчана некалькі істотных памылак, якія фактычна пярэчаць самой ідэі рэарганізацыі і якія могуць завесьці гэта параходзтва ў гаспадарчы тупік.

Днепра-Дзьвінскае параходзтва арганізавана з двух самых запушчаных у тэхнічных адносінах вучастка: Дняпроўскага і паўночна-заходніх раёнаў.

Між тым, толькі частковае палепшэньне водных шляхоў БССР дало-б значнае павялічэньне грузазвароту, забясьпечыла-б сродкамі сувязі рад раёнаў, якія пазбаўлены якіх-бы там ні было шляхоў, апрача водных (Бесядь, Мяжа, Обша, Усвяць) і палегчыла-б работу чыгуначнага транспарту.

Вызначаны пры рэарганізацыі флёт для ДДРТ ні на колькасьці, ні асабліва па сваіх тэхнічных якасьцях ня можа быць прызнан здавальняючым і ў асноўным не падыходзіць для работы па водных шляхох БССР. Састаў паравога флёту стары (карлусы з 1871 г., катлы маюць па 40—45 год), магутнасьць ад 45 НР да 150.

Характэрна, што параходы «Решительный» і «Лев», якія насьпяхова працавалі на водных шляхох БССР, чамусьці былі заграны і ўзамен іх далі непрыстасаваныя да нашых умоў.

Пры разьдзеле ня ўлічаны асаблівасьці стану водных шляхоў БССР, дзе ўвесь час прыходзіцца падтрымліваць глыбіны шляхам зямлячарпальнай работы. Між тым, пры вылучэньні тэхнічнага флёту Днепра-Дзьвінскаму басэйну зусім ня зьвяначылі зямлячарпалак.

Асноўная памылка пры падзеле заключаецца ў тым, што найбольш насычаныя пасажырскія лініі БССР — Гомельскую і Мазырскую пакінулі Дняпроўскаму кіраўніцтву. У выніку Днепра-Дзьвінскі басэйн зафіцытны, паколькі асноўныя пасажырскія перавозкі, найбольш даходныя, ім не праводзяцца. Можна проста сказаць, што, калі лініі Гомель-Кіеў і Мазыр-Тураў будуць у эксплёатацыі Днепра-Дзьвінскага басэйну, ён не толькі выйдзе з дэфіцыту, але стане прыбытковым.

Перадача вышэйуказаных ліній ДДРТ не адабе'ецца на фінансавым становішчы Дняпроўскага рэчнага транспарту, паколькі апошні працуе на сярэнім і ніжнім Дняпры па нарманаваных глыбінях. Для Днепра-Дзьвінскага-ж басэйну гэта пытаньне жыцьця, бо адсутнасьць гэтых ліній робіць нерэнтабельным існаваньне самастойнага параходзтва.

Арганізацыя ў Беларусі самастойнага кіраўніцтва рэчнага транспарту зьявілася неабходнай справай. Гэта значна ажывіла работу нашых водных шляхоў, што адзначана ўжо ўрадам БССР. Гэта пацьвярджаецца і тым, што ў навігацыі 1932 г. Днепра-Дзьвінскі басэйн ідзе першым из выкананьні трансфінпляну.

Пры рэарганізацыі была дапушчана яшчэ адна памылка, што транзіт з БССР на поўдзень быў перададзены выключна Дняпроўскаму рэчнаму транспарту. Гэта ў той час, калі Днепра-Дзьвінскаму басэйну за ўнутраных водных зносінах не хапае такой колькасьці грузаў, якая-б забясьпечыла бесьперабойную работу ўсяго флёту на ўвесь перыяд навігацыі.

Акрамя палепшэньня работы самога воднага транспарту, прадстаўленьне ДДРТ транзіту з БССР на поўдзень і назад дасьць вялікую карысьць і народнай гаспадарцы БССР і УССР. Гэта ня цяжка зразумець. Паводле пастановы ўраду, грузы, вывозяць па прыстані да адкрыцьця навігацыі. Транзітны флёт Дняпроўскага басэйну нават калі ён загружаецца яшчэ ў часе стаянкі на лёдзе, пры адкрыцьці навігацыі, ідзе ўверх, у БССР 20—25 дзён. Калі 10 дзён цягнецца разгрузка і нагрузка. У выніку грузы, напрыклад, па Данбас дастаўляюцца з пратэрмінуўкай на 35—40 дзён.

Калі-ж Днепра-Дзьвінскаму рэчнаму транспарту будзе дана магчымасьць праводзіць транзітныя апэрацыі, такія фэхты будуць, бязумоўна, напярэджаны, бо грузы з прыстані будуць неадкладна загружацца і з адкрыцьцём навігацыі адразу транспартавацца на поўдзень.

Толькі выпраўленьне дапушчаных пры рэарганізацыі памылак, актыўная дапамога ўсёй грамадзкасьці і друку забясьпечаць шпаркае разьвіцьцё водпага транспарту БССР.

А. ОЛЬКЕС.

АД РЭДАКЦЫІ: Прапановы т. Олькес заслугоўваюць увагі. Мы просім зацікаўленыя арганізацыі выказаць сваю думку.

В. Рудніцкі

Культурнае будаўніцтва БССР да XV гадавіны Кастрычніка

Савецкая Беларусь падыходзіць да 15-ай гадавіны Кастрычніка з найвялікшымі перамогамі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, шпарка ліквідуючы сваю эканамічную і культурную адсталасьць.

Вялікая напружанасьць сіл патрабавалася з боку працоўных БССР, каб пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на аснове правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, пры вялікай дапамозе брацкіх, саюзных рэспублік, ва ўмовах, калі пасьля Кастрычніка, аж да 1920 году Беларусь была арэнаю войнаў і акупацый, каб пасьля ўсяго гэтага атрымаць тыя вялізарныя дасягненьні ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, што мы маем у Савецкай Беларусі зараз.

Беларусь у асноўным — краіна суцэльнай пісьменнасьці. Бурным тэмпамі расьце сетка навуковых і навукова-дасьледчых устаноў. Будуецца культура сацыялістычная па зьместу, нацыянальная па форме.

Калі ў 1914-15 г. г. ахоп дзяцей школьнага ўзросту складаў 43,9 проц., дык зараз усе дзеці Савецкай Беларусі ахоплены школамі. Вырасла сетка нацыянальных школ: **232** яўрэйскія школы, **258** польскіх, **24** латышскіх, **11** літоўскіх, **23** украінскіх, **9** нямецкіх, **85** рускіх, эстонскія, чэшскія, татарскія школы — вось кынік правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі і ўраду.

Да рэвалюцыі на Беларусі ня было ні адной вышэйшай школы, з нацыянальнымі аддзяленьнямі, дзе навучаецца **15132** студэнты.

Адкрываюцца самастойныя яўрэйскія і польскія пэдагагічныя інстытуты, шырока разгарнулася сетка завочнага, сярэдняга і вышэйшага навучаньня. **17.760** маладых рабочых і калгасьнікаў навучаюцца ў **61** рабфаку. **37** пэдагагічных тэхнікумаў рыхтуюць зараз кадры настаўнікаў для школ першай ступені, у той час, як да рэвалюцыі была **толькі адна настаўніцкая семінарыя.**

А колькі індустрыяльных сельска-гаспадарчых тэхнікумаў розных спэцыяльнасьцяй мае БССР! Іх палічваецца 69 дзенных і 8 вячэрніх з лікам 10.937 студэнтаў. У адных толькі ФЗВ, саўгасвучах і калгасвучах навучаецца 46 тыс. вучняў.

Шырока разгарнулася сетка палітыка-асьветных устаноў. 1411 вясковых і 81 раённых дамоў сацыялістычнай культуры: 158 клюбаў; 404 стацыянарных тэатры; 714 кіно-перасовак, 31 кіно-тэатраў, 16 тэатраў (у тым ліку яўрэйскі і польскі)—гэта зараз. У мінулым да рэвалюцыі Беларусь мела **толькі** 4 дробненькіх саматужных тэатры.

Расьце і літаратура, сацыялістычная па зьместу, нацыянальная па форме. У гэтым годзе наша Беларускае дзяржаўнае выдавецтва выпускае **2738** назваў розных кніг з тыражом у 18.612 тыс. экз. А колькі ёсьць у нас іншых выдавецтваў пры устанёсьць у нас іншых выдавецтваў пры ўстаёсьць у нас іншых выдавецтвах пры ўстаёсьць у нас іншых выдавецтвах пры ўстаёсьць у нас іншых выдавецтвах

Шырока разгарнуць выраб тавараў шырспажыву

„Усямернае ўмацаваньне выробу тавараў шырокага ўжытку зьяўляецца ў даны момант аднэй з важнейшых гаспадарча-палітычных задач“ (з рэзалюцыі верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б)

Даць сырэц прамарцелі „Пралетары“

Прамысловая арцель «Пралетары» — адна з буйнейшых арцеляй у горадзе Менску. У ёй працуе каля 400 чал. Па мэханізацыі вытворчых працэсаў она мае вытяг фабрыкі. Машыны і варштаты прыводзяцца ў рух электрычнасьцю.

У першых літах ліценя арцель пераключылася на выраб прадуктаў шырокага ўжытку. Для гэтай мэты зылучана спэцыяльна 84 чал. членаў арцелі. Пераведзены выключна на выпрацоўку шырспажыву тры цэхі.

У кушнерным цэху працуе 22 чал. 3 футровых адкідаў, якія арцель атрымлівае ад фабрыкі «1 мая» (Менск), цэх на працягу месяца выробляе 4.000 футровых каўняроў для мужчынскіх і жаночых польтаў. Адкіды, якія застаюцца ад каўняроў, скарыстоўваюцца для выробу блямаў (футравы сюд для куртак).

Шапачны цэх налічвае таксама 22 асобы. З тэкстыльных адкідаў выробляюцца летнія мужчынскія шапкі, з футравых — зімовыя шапкі.

22 чал. ва ўцільцэху заняты непасрэдна пераапрацоўкай уцілю (старая вопратка), з якога выробляюцца ватныя целагрэйкі, штаны і рабочыя рукавіцы.

Брыгада ў складзе 10 чал. у беласпэйным цэху выпускае штодзенна з тэкстыльных адкідаў і пераапрацаванай ваты 30 цёплых дзіцячых коўдраў.

У суконна-масавым цэху брыгада з 10 асоб працуе над выробам цёплых суконных курток з футравым сюдам з адкідаў. Готыя куртки выробляюцца спэцыяльна для вёскі.

У трэцім квартале арцель значна адставала ў выкананьні праграмы па шырспажыву. У ліцені і жніўні плян выконваўся на больш, як на 40—50 проц. У верасьні крывая выкананьня прамфінпляну значна ўсьпялася, аднак усё-ж запазычанасьць за мінулыя месяцы засталася непакрытай.

Плян трэцяга кварталу выкананы усяго толькі на 83,6 проц.

Адставаньне тлумачылася нязгрунтаванасьцю прастояў і прагулаў. Перашкаджала яшчэ пасьпяховаму выкананьню праграмы і невыстарчальнае забесьпячэньне арцелі сырцом (тэкстыль і футравыя адкіды). З-за непаваротлівасьці сэктару снабжэньня Белкаапрамсавету, суконна-масавы цэх арцелі прастаяў у жніўні месяцы калі двух тыдняў з прычыны недаатрыманьня сырцу.

Трэба сказаць, што і зараз ёсьць недарэчнасьць у забесьпячэньні арцелі сырцом. Менскія швэйныя фабрыкі імя Крупскай і «Кастрычнік» павінны перадаваць нескарыстаныя ў сябе адкіды арцелі «Пралетары». Аднак, на справе гэтага ня робіцца. Дырэкцыі фабрык упарта не жадаюць заключаць дагавары з арцельлю на перакідку нескарыстаных на фабрыках адкідаў.

Белшвэйаб'яднаньне яўна бюракратычна падыйшло да вырашэньня гэтага пытаньня. У той час, як менскія швэйныя арцелі («Пралетары» і інш.) маюць патрэбу ў сырцу, Белшвэйаб'яднаньне адпраўляе тэкстыльныя адкіды з менскіх швэйных фабрык у арцелі Гомелю, трацячы дарэмна на перакідку значныя сумы грошай.

У чацьвертым квартале карэнная перабудова работы арцелі, узмацненьне дапамогі цэхам і брыгадам дало магчымасьць значна ўзьняць крывую выкананьня прамфінпляну. За 18 дзён кастрычніка праграма па шырспажыву выканана на 118 проц.

Зараз у сувязі з праведзенай пашпартызацыяй абсталяваньня, машыны, варштаты і ўвесь інвэнтар замацаваны за цэхамі, брыгадамі і пасьпэцыяльнымі рабочымі. За псаваньне абсталяваньня ўстаноўлена матар'яльная адказнасьць.

Узмацнілася барацьба з бракам у выробе прадукцыі шырспажыву. Тэхкантралёры ў часе вытворчых апэрацый ліквідуюць усякія дэфэкты, што вялікаюць брак. Члены арцелі, якія выробляюць брак, нясуць за гэта матар'яльную адказнасьць.

У аспоўным ліквідавана ўраўнілаўка ў зарплаце. Зараз усе члены арцелі пераведзены на індывідуальную зьдельшчыну. Гэта значна ўзьняло прадукцыйнасьць працы і зарплату кожнага члена арцелі.

Побач з дасягненьнямі ёсьць і рад недахопаў у рабоце. Сорам нават сказаць, арцель, у якой працуе каля 400 чал., мае ўсяго толькі двух камуністаў і аднаго кандыдата партыі. Партыйная ячэйка, якая складаецца з камуністаў трох арцеляй («Пралетары», «Новы шлях» і імя Крупскай), не займаецца пытаньнем росту ячэйкі за лік старых лепшых ударнікаў членаў арцелі. Ёсьць выпадкі, калі заявы, паданыя членамі арцелі аб уступленьні ў партыю, марынуюцца ў ячэйцы больш, як на паўтары гады. Партыйна-масавая работа ў арцелі «Пралетары» амаль зусім адсутнічае.

Не разгорнута і прафсаюзная работа. Групком зусім невыстарчальна праводзіць палітвыхаваўчую работу сярод членаў арцелі. Аб гэтым выразна сьведчыць той факт, што сацспаборніцтвам ахоплена ўсяго толькі 50 проц. усёй колькасьці арцельшчыкаў.

На ўжываецца патрэбных мер, каб павялічыць сабекошт прадукцыі шырспажыву. Цёплыя куртки з футравым сюдам, якія прадназначаны для вёскі, каштуюць 90 руб. Зразумела, што на сваёй цане яны ня зусім даступны калгасьніку і беднаку — адпасобніку.

Ня зусім добра стаіць справа і з паляпшэньнем снабжэньня членаў арцелі. Ёсьць сталоўка, якая яднае тры арцелі, але абеды ў ёй вельмі нізкай якасьці, ды да таго-ж яшчэ вельмі дарагія — ад 60 кап. да 1 руб. 15 кап. Самазагатоўкі — сродак паляпшэньня грамадзкага харчаваньня і снабжэньня, могуць не праводзіцца.

У справе снабжэньня з боку Белкаапсаюзу назіраецца яўнае ігнараваньне арцелі. Ні адзін член арцелі «Пралетары» з ліку 400 не прымацован да ЗРК. Такое становішча і па астатніх арцелях гораду. Белкаапсаюз камусьці палічыў лішнім стварыць ЗРК для арцеляй.

Толькі зараз Белкаапсаюз пабы зьлітаваўся над арцелямі і стварае адзін ЗРК для 26 арцеляй, з колькасьцю людзей каля 4.000 чал. Зразумела, гэта фармальнасьць у выраішэньні данага пытаньня.

Белкаапрамсавет, на які ўскладзена агульнае кіраўніцтва арцелямі, не аказвае арцелі «Пралетары» абсалютна ніякай дапамогі. Жывое, канкрэтнае і апэрацыйнае кіраўніцтва падмяняецца бюракратычнай пісаніной. На працягу году ў арцелі ня было ні аднаго прадстаўніка Белкаапрамсавету, які-б дапамог у рабоце.

Ад Белкаапрамсавету, у сувязі з абвяшчэньнем мітынгу-пераклічкі прадпрыемстваў і арцеляй па шырспажыву, патрабуецца сапраўдны паварот тварам да арцеляй, каб кіраваць канкрэтна, а не наогул.

Н-н.

Адсутнічае штодзеннае кіраўніцтва

Менская абутковая фабрыка мае вялікія магчымасьці для выробу прадметаў шырокага спажываньня. Ёсьць вялікая колькасьць скураных абрэзкаў, але яны поўнасьцю не выкарыстоўваюцца.

У 3-м квартале праграму ў 3000 пар абутку фабрыка значна перавыканала, але посьпех гэты не замацован у 4 квартале.

Зараз на фабрыцы створан уцільцэх, у якім працуе 26 чал. Цэх павінен штодзенна выпускаць па 50 пар паўбацінак, дзіцячага абутку, жаночых паяскоў, 11 дыванькоў і 2249 пар набоек. Але на справе прамфінплян ня выконваецца. За 12 дзён кастрычніка выпушчана ўсяго толькі 64 дыванькі, што складае 48,4 проц. 154 пары дзічага абутку — 27,3 проц. і 11950 пар набоек — 44,2 проц.

Прычыны адставаньня уцільцэху—адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва й дапамогі з боку дырэкцыі і фабрычных арганізацый. Кіраўніцтва работай уцільцэху, бязумоўна, справа дырэкцыі фабрыкі. Між тым, дырэкцыя ўскладала адказнасьць за работу апошняга на бюро рацыяналізацыі.

Партыйны калектыў фабрыкі ня цікавіцца работай уцільцэху, на працягу больш месяца ніхто з бюро партыйнага калектыву ня зайшоў у цэх, каб дапамагчы кіраўніцтву цэху ў паляпшэньні работы.

З боку пасобных кіруючых работнікаў фабрыкі наглядаецца яўнае ігнараваньне уцільцэху. Загадчык мантажнага цэху тав. Тамашоў, напрыклад, адмовіўся даць рабочых для рамонту варштату уцільцэху.

Мала зьвяртае ўвагі на работу уцільцэху і фабрычны камітэт. На пытаньне, што зроблена фабкомам у справе паляпшэньня работы ў цэху, старшыня фабкому тав. Лup'ян адказаў: «Стварылі грамадзкую думку вакол гэтага пытаньня, 20 кастрычніка будзем слухаць справаздачу загадчыка цэху».

Стаповіцца незразумелым, якая-ж думка створана фабкомам навокал работы уцільцэху, калі цэх застаецца без прафупаўнаважанага, прамфінплян не даведзен да рабочых, ня ўсе рабочыя охоплены зьдельшчынай, адсутнічае вучот прадукцыі, якая выробляецца, у выніку рабочыя ня ведаюць колькі яны зарабляюць.

Ёсьць недарэчнасьць з разрадамі. Плянавік фабрыкі тав. Маламэд запэўняе, што ў цэху працуюць толькі рабочыя 2-га і 3-га разраду, на справе-ж ёсьць рабочыя 4-га разраду. Адсюль, зразумела, ёсьць блытаніна і ў зарплаце рабочых.

Зараз цэх рыхтуецца да выробу балетак, ёсьць дастатковая колькасьць сырцу для гэтай мэты, але не хапае абсталяваньня. Дырэкцыя фабрыкі ня турбуецца, каб у блізкі час набыць яго й стварыць спрыяючыя ўмовы для работы уцільцэху.

Дрэнна стаіць справа і з якасьцю прадукцыі. З-за адсутнасьці бракера рабочыя уцільцэху выробляюць шмат браку.

На дырэкцыю фабрыкі, партканкалектыў і фабком ускладаецца задача — павярнуцца сапраўды тварам да уцільцэху і стварыць спрыяючыя ўмовы для бесьперабойнай работы з тым, каб у бліжэйшыя дні ліквідаваць адставаньне.

Ф-ў.

Ліквідаваць адставаньне па выпуску шырспажыву

Паводле пастановы калегіі Наркамлёгпраму БССР з 2-га жніўня па 2-га верасьня праводзіўся месячнік барацьбы за максымальнае скарыстаньне адкідаў вытворчасьці на выраб прадметаў шырокага спажываньня. Каб забясьпечыць посьпех месячніка быў абвешчан конкурс і вызначан фонд прэміяваньня ў суме 5 тыс. руб. На разгортваньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў у рабоце уцільцэхаў асигнавана было 2 тыс. руб. прэміі.

Трэба сказаць, што месячнік даў значны зрух у паляпшэньні работы уцільцэхаў. За трэці квартал 22 уцільцэхі, якія створаны на прадпрыемствах Наркамлёгпраму, выканалі сваю праграму на 95 проц. Пасобныя галіны выйшлі з ніздрэннымі вынікамі. **Скураная прамысловасьць**, напрыклад, выканала вытворчую праграму па шырспажыве на 144,8 проц., **шкляная** — на 120,8 проц., **швэйная** — на 105,3 проц. і **абутковая** — на 95,3 проц.

Рад прадпрыемстваў, дзе максымум увагі фабрычна-заводзкіх трыкутнікаў быў зьвернут на работу уцільцэхаў, дабіліся перавыкананьня заданьня. Шклозавод **«Пралетары»**, напрыклад перавыканаў плян на 98 проц., **Гомельская гарбарня** — на 76 проц., Віцебская — на 68,9 проц., швэйная фабрыка **«Камінтэрн»** — на 59,9 проц., фабрыка **«8-га сакавіка»** — на 28,2 проц., імя **Дзяржынскага** на 26,7 проц., **Магілеўская шерная** — на 26,5 проц., фабрыка **«Кастрычнік»** — на 17,7 проц., **гомельская абутковая** — на 10 проц., **менская** — на 6,9 проц., шклозавод **«Неўка»** — на 4,5 проц. і гарбарня **«Бальшавік»** — на 0,8 проц.

Аднак, рад прадпрыемстваў яшчэ і да гэтага часу адстаюць у выкананьні праграмы. Швэйная фабрыка імя **Валадарскага** дала ўсяго толькі 29,3 проц. выкананьня, імя **Крупскай** — 39,4 проц., швэйная **«Прафінтэрн»** — 48,7 проц., **«Сьцяг індустрыялізацыі»** — 51,8 проц. й **віцебская абутковая** —87,8 проц.

Работу уцільцэхаў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасьці ў цэлым нельга прызнаць здавальняючай. Уцільцэхі на большасьці прадпрыемстваў недаукамплектаваны яшчэ кваліфікаванай рабочай сілай. Адсутнічае выстарчальная колькасьць патрэбнага абсталяваньня. Адсутнасьць мэханізацыі вытворчых працэсаў у значнай меры павялічвае сабекошт прадукцыі. Гаспадарчы разрахунак, які-б стымуляваў уздым прадукцыйнасьці працы, ва уцільцэхах не укарэнен. Няма ўліку і збору адыходаў якія могуць ісьці на выраб прадметаў шырспажыву. Ня ўлічаны патрэбы рынку і ў аднаведнасьці з гэтым ня вызначан пастаянны асартымэнт прадукцыі. Прадукцыя, якая выробляецца уцільцэхамі, яшчэ і да гэтага часу застаецца вельмі нізкай якасьці.

Гаспадарнікі зусім слаба зацікаўлены работай уцільцэхаў. Рабочая грамадзкасьць і ІТР не мабілізаваны на разгортваньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і паляпшэньне тэхналёгічнага працэсу ў выробе прадметаў шырспажыву.

У радзе месц прафсаюзныя арганізацыі ня лічаць сваім абавязкам дапамагаць у рабоце уцільцэхам. Ня так даўно Наркамлёгпрамам БССР быў накіраваны прадстаўнік скуранога трэсту тав. **Шчыбук** у Гомель для правядзеньня месячніка па арганізацыі і паляпшэньні працы уцільцэхаў. Старшыня Гомельскага гарпрафсавету ня толькі не аказаў яму дапамогі, але нават адмовіўся сабраць сход актыву рабочых і ІТР прадпрыемстваў гораду.

Праграма выпуску прадметаў шырокага спажываньня па Наркамлёгпраму на чацьверты квартал павялічана супроць III кварталу на 869,2 тыс. руб. Ажыцьцяўленьне яе патрабуе ад гаспадарнікаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый прадпрыемстваў максымальнай напружанасьці сіл.

Мітынг-пераклічку прадпрыемстваў і арцеляй па шырспажыве, які абвясьцілі «Зьвязда» разам з ЦСПСБ, упаўнаркамцяжпраму, Наркамлесу, Наркамлегпрамам і Белкаапрамсавецам трэба скарыстаць для карэннай перабудовы і паляпшэньня работы уцільцэхаў. Вопыт перадавых прадпрыемстваў па шырспажыву трэба перадаць адстаючым з тым, каб ліквідаваць адставаньне і выкрыць запазычанасьць мінулага часу ў чацьвертым квартале.

Русановіч.

Уцільцэх на Бярэзінскім камбінаце— забыты вучастак

Магчымасьці ў Бярэзінскага камбінату (Нова-Барысаў) выробляць прадметы шырокага спажываньня вельмі вялікія. Наяўнасьць адыходу фанэркай і сярнікоўай вытворчасьці мае шырокае поле дзейнасьці ўцільцэху.

Першым пачаткам у скарыстаньні адыходу была прапанова тав. Гарэнсона аб выробе ліпеек і трыкутнікаў з абрэзкаў фанэрных сядзеньняў. Па пляну штодзенна павінна быць выраблена ня менш 5 тысяч штук ліпеек й трыкутнікаў, а выробляецца ўсяго 2-3 тыс.

Прычына такога адставаньня — недапушчальна наплывацельскія адносіны да уцільцэху з боку кіраўніцтва камбінату.

Уцільцэх выробляе таксама канцылярскія прэсы і мяшочкі для аптэкарскіх магазынаў. Ужо больш месяца працуе цэх, але рабочыя ня ведаюць, як будзе аплачвацца праца, бо няма норм і расцэнак. У выніку некаторыя рабочыя да працы адносяцца абыякава.

Праца цэху тармозіцца адсутнасьцю добра якасных інструментаў: цыркулярных пілак й інш. Адзел снабжэньня на гэта не зьвяртае ўвагі. У цэху, дзе працуюць абрэзчыкі, няма ацяпленьня, пабіты шыбы, рабочым прыходзіцца працаваць у польтах.

Для пасьпяховай працы уцільцэху неабходна мець цэлы рад новага абсталяваньня. Патрэбны тры шліфовачныя варштаты, дадатковы такарны варштат па дрэву і інш.

Зараз разгортваецца праца па выпуску прадметаў шырокага спажываньня, як выраб гонты, тарных дошак й інш.

Гэта работа павінна стаць неадрыўнай часткай працы ўсяго камбінату.

Кіраўніцтва камбінату павінна сур'ёзна заняцца ўцільцэхам і мабілізаваць рабочых і ІТР на выкананьне настаноў партыі ў справе дадатковага выробу тавараў шырспажыву.

Б. Райнес.

АГЛЯД ЗАМЕЖНАЙ ПРЭСЫ

Крызіс і радыё...

Рэцэпты пякуцца як бліны. Што ні дзень, то новы рэцэпт. Польская буржуазная прэса зараз вельмі нагадвае кірмашовага фокусьніка. На яе старонках з выключнай шпаркасьцю фабрыкуюцца нязьлічоныя рэцэпты «выратаваньня грамадзтва ад паўпэрызацыі», з якіх кожны спаборнічае з іншым па сваёй, скромна кажучы, недарэчнасьці. Гутарка ідзе аб крызісе і прапановах буржуазнай прэсы па барацьбе з яго спусташальнымі вынікамі.

Яшчэ нядаўна польская буржуазная прэса з запалам крычала, што лепшай зброяй супроць крызісу зьяўляецца... ужываньне асьпірыны. Гэта быў не анэкдот, а проста чарговая афёра газэтных лекараў гніючага капіталізму. Варшаўская і віленская прэса, не шкадуючы сваіх сіл, запэўніла, што... асьпірына, так сказаць, гартуе грамадзтва для барацьбы з крызісам.

Авантурыцкая дэмагогія пацярпела, як і трэба было чакаць, самае ганебнае фіяска. Прышлося вышукваць новыя рэцэпты «выратаваньня грамадзтва ад паўпэрызацыі»...

Напрабавалі спэкулянуць на ашуканчым антымізьме. Уся польская буржуазная прэса з вар'яцкай энэргіяй стала раптоўна прапаведваць «...пачатак паляпшэньня гаспадарчай кан'юнктуры ў Польшчы». Цяжка, аднак, захаваць шыла ў мяшку. Не ўдалося гэта зрабіць і газэтным обэр-ашуканцам. Можна колькі хочаш крычаць аб «паляпшэньні гаспадарчай кан'юнктуры», але калі польскі дзяржаўны бюджэт толькі за першыя пяць месяцаў бягучага году (паводле афіцыяльных даных) даў дэфіцыт у 92.900.000 злотых, а ў такім буйным прамысловым раёне, як Дамброўскі басэйн, спыняюць работу ўсе асноўныя прадпрыемствы (таксама паводле афіцыяльных даных), дык ніякі антымістычны крык нічога ня зробіць.

Адным словам, вэрсія аб міфічным «паляпшэньні гаспадарчай кан'юнктуры», пад гледзячы на шалёныя намаганьні фашысцкіх борзапісцаў, трашчыць па ўсіх швох. Паколькі і з асьпірынай і з «паляпшэньнем кан'юнктуры» польская буржуазная прэса, проста кажучы, аскандалілася, у ход пускаюцца новыя рэцэпты, упаўнаважаныя... кішчаткова дабіць крызіс. Зараз варшаўская прэса прапаведуе «добрадзейнасьць радыё», як зброю зьнішчэньня «...паўпэрызацыі грамадзтва». Новая ідэя, хоць яе цынічны абсурд так і б'е ў вочы, пакуль што карыстаецца поўным посьпехам у буржуазнай прэсы.

Тон задае «аналізыйная» «Газэта варшавска». 9 кастрычніка яна выступіла са спэцыяльным артыкулам «Перашкодзім паўпэрызацыі грамадзтва». У чым-жа гэта «перашкоджаньне» заключаецца?.. Перш за ўсё «Г. В.» прымушана была прызнацца, што

«... ГАСПАДАРЧЫ КРЫЗІС ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА».

А гэта вымагае ад польскіх грамадзян

«... ДАЛЕЙШАГА АБМЕЖАВАНЬНЯ ВЫДАТКАЎ. АХВЯРА ПРЫМУСОВАЙ АШЧАДНАСЬЦІ ЗАКРАНАЕ НЯ ТОЛЬКІ ВЫДАТКІ НА ВОПРАТКУ І ХАРЧАВАНЬНЕ. ПАДАЮЦЬ СУМЫ, — пралівае сьлёзы «Газэта варшавска», — ВЫЗНАЧАНЫЯ ДЛЯ НАБЫЦЬЦЯ КНІГ, НА ТЭАТР І Г. Д.».

Карацей кажучы, у паяўнасьці «поўная паўпэрызацыя грамадзтва». Штосьці трэба рабіць. Неяк трэба ратавацца. «Газэта варшавска» ня сумуе. Яе настроі больш чым ружовыя. Аказваецца «паўпэрызацыю грамадзтва» можна адным махам зьнішчыць праз... радыё. З крызісам, аказваецца, можна пакончыць пры дапамозе... самых звычайных лямпавых або дэтэктарных прыёмнікаў. Выратаваньне — «у добрадзеянькі радыё».

«Набывайце прыёмнікі», — ва ўвесь голас крычаць хапжы з «Газэты варшавскай» і... з паўпэрызацыяй грамадзтва ў Польшчы будуць пакончаны ўсе рахункі, а крызіс стане, па меншай меры, ня страшным.

Замест хлеба і работы галодным масам беспрацоўных, такім чынам, прапануюцца... радыё-прыёмнікі. Навошта патрабаваць нейкі празаічны кавалак хлеба? Навошта абурацца бязьлітасным зьнішчэньнем і без таго мізэрнай «дапамогі» беспрацоўным (апошнім дэкрэтам польскага сойму «дапамога» беспрацоўным зьніжана на 50 проц.), калі ўсю справу можа з посьпехам вырашыць радыё...

Радыё-прыёмнікі, паводле гарачых запэўненьняў «Газэты варшавскай», дапамогуць галадаючым масам «наблізіцца да культурнага жыцьця»...

Гнусны цынізм, варты польскай буржуазнай прэсы!

Шпоўныя барацьбіты з крызісам і паўпэрызацыяй канкрэтызуюць сваю ідэю да самай, так сказаць, дробнай дэталі. «Г. В.» праяўляе такую гераічную велікадушнасьць, што самаддана прапануе «паўпэрызаванаму грамадзтву» замяніць дарагія лямпавыя прыёмнікі звычайным дэтэктарам...

«... ПАКОЛЬКІ ЛЯМПАВЫ ДЭТЭКТАР КАШТУЕ ДОРАГА, МОЖНА ЗАДАВОЛІЦЦА І ДЭТЭКТАРНЫМ ПРЫЁМНІКАМ».

І так, масам, зацэпнутым у жалезнае кола галечы і голаду, беспрацоўным, да канца абрабаваным фашысцкай дыктатурай, замест хлеба і работы міласьліва дазвяляюць «...набываць радыё-прыёмнікі». На зьмену збанкрутаваўшай вэрсіі аб «паляпшэньні гаспадарчай кан'юнктуры» прыходзіць дэмагогія аб «добрадзейнасьці радыё ў барацьбе з паўпэрызацыяй».

Як мыш на гнучым судне, буржуазная прэса кідаецца ва ўсе бакі ў пошуках выратаваньня ад руйнуючых удараў крызісу. Абсурд сьледуе за абсурдам, афёра за афёрай. Агідная камэдыя з «добрадзейнасьцю радыё» разьлічана на чарговую містыфікацыю мас.

Нумар ня пройдзе. На краіне ўсё мацней гузьдзе грозныя раскаты нарастаючай рэвалюцыйнай павальніцы. Масы працоўных пачынаюць разумець, што адзіным «рэцэптам» ад крызісу, голаду, паўпэрызацыі зьяўляецца пралетарская рэвалюцыя!

Хаос, нядоля, сьлёзы...

Да такіх слоў прыходзіцца прыбягаць польскай буржуазнай прэсе, калі яна пачынае гаварыць аб становішчы школ і інтэлігенцыі ў Польшчы.

Можна сабе ўявіць чым зьяўляецца ў сапраўднасьці гэта становішча, калі нават газэтныя глашатаі польскага фашызму прымушаны карыстацца такімі словамі, як «хаос, нядоля і сьлёзы».

Скандальны факт для польскай буржуазнай прэсы! Хіба гэта не яна, параўнаўча яшчэ нядаўна, пісала, што Польшча ёсьць «непарушны бастыён культуры і цывілізацыі», які ахоўвае «эўрапэйскае грамадзтва» ад «бальшавіцкай сякеры». І вось цяпер ім, гэтым прапаведнікам фашысцкай «цывілізацыі», прыходзіцца прызнавацца, што на тэрыторыі «бастыёну культуры» школа, студэнцтва, інтэлігенцыя перажываюць «хаос і нядолю».

Дзесяткі тысяч пэдагогаў, інжынэраў, тэхнікаў, працаўнікоў мастацтва ў фашысцкай Польшчы апынуліся на вуліцы. Капіталістычная сыстэма бязьлітасна выкінула іх у рады гіганцкай арміі «лішніх людзей». Перад імі — ніякіх пэрспэктыў нават на самы мізэрны заработак. Яны бясплённа мараць аб месцы хоць-бы афіцыянта ў рэстаране, або начнога вартаўніка. Ня ўсіх, аднак, чакае такое «шчасьце»...

Старонкі польскай прэсы запоўнены наступнымі нязьлічонымі аб'явамі:

«ІНЖЫНЭР-ТЭХНОЛЁГ, АЎТАР МНОГІХ ВЫДАТНЫХ ПРАЦ ПРОСІЦЬ ЯКОЙНЕБУДЗЬ РАБОТЫ, ХОЦЬ НАЧНЫМ ВАРТАЎНІКОМ, ТОЛЬКІ-Б УНІКНУЦЬ ГАЛОДНАЙ СЬМЕРЦІ» («Роботнік» ад 11-га кастрычніка).

Гэты інжынэр публікуе сваю, поўную бязьмежнай роспачы аб'яву амаль кожны дзень. Жудасны крык беспрацоўнага інжынэра застаецца непачутым. Ніхто ня прыходзіць на дапамогу. Каму ў фашысцкай Польшчы патрэбны яго вопыт і веды, калі, скажам, адна толькі мэталёвая прамысловасьць загружана тут усяго на 20 проц. сваёй магутнасьці.

Аб'явы інжынэра-тэхналёга — найбольш паказальны факт становішча інтэлігенцыі ў Польшчы. Нават самыя махровыя органы фашысцкай рэакцыі, як напрыклад клерыкальная «Полёнія», перад тварам гэтых фактаў, сьцяўшы зубы, прызнаецца, што

«... СТАНОВІШЧА ПРАЦОЎНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ ЎСЁ ПАГАРШАЕЦЦА. НІ Ў АДНЭЙ ГРУПЫ ПРАЦАЎНІКОЎ НЯМА ТАКОЙ ТРАГІЧНАЙ СІТУАЦЫІ, ЯК СЯРОД ЛЮДЗЕЙ РАЗУМОВАЕ ПРАЦЫ».

А «Газэта варшавска» на ўнісон «Полёніі» з трывогай крычыць, што ў школах фашысцкай Польшчы пануюць

«... ХАОС І НЯДОЛЯ».

Ня можа знайсьці іншых слоў для апісаньні школьнай справы і становішча інтэлігенцыі ў Польшчы і ўрадавы афіцыёз «Газэта польска». Калі ўжо старыя вопытныя інжынэры дарэмна шукаюць выратаваньня ад галоднай сьмерці, дык што-ж гаварыць аб пэрспэктывах будучых інжынэраў, тэхнікаў, пэдагогаў — студэнтаў польскіх унівэрсытэтаў.

«Што рабіць» — гэта пытаньне паўстала ва ўсёй сваёй страшнай велічыні перад студэнцкай моладзьдзю. Наперадзе пасьля дыплёмаў яна бачыць грозныя здані голаду і беспрацоўя. Усё большыя масы студэнцтва пачынаюць адчуваць сябе, скажам словамі «Газэты польскай»

«... АДУКАВАНЫМІ, АЛЕ НЕПАТРЭБНЫМІ ІСТОТАМІ».

«Газэта польска» зьмяшчае наступны ліст адной студэнткі, які, паводле думкі рэдакцыі, ярка малюе «безнадзейнасьць сітуацыі студэнцтва»:

«ШТО РАБІЦЬ — ГЭТА ЖУДАСНАЕ ПЫТАНЬНЕ НЕ ДАЕ МНЕ СПАЦЬ ПА НАЧОХ, НЕ ДАЕ ЖЫЦЬ. «ШТО РАБІЦЬ» ПРАСЬЛЕДУЕ МЯНЕ ЎВЕСЬ ЧАС. АХ, Я ВЕДАЮ: МНЕ ЎСЕ АДЗІНЫМ ХОРАМ СКАЖУЦЬ—ПАШУКАЙЦЕ РАБОТЫ, КАЛІ ВЫ Ў ТЭЙ МІНУЦЕ ПАГЛЯДЗЕЛІ НА МЯНЕ, ДЫК УБАЧЫЛІ-Б: НА ВАЧОХ—СЬЛЁЗЫ, НА ВУСНАХ — ПАГАРДЛІВЫ СЬМЕХ...»

«Сьлёзы па вачох» у шматтысячнай студэнцкай моладзі, «жудаснае пытаньне што рабіць» — такава яна «цывілізацыя і культура» па-фашысцку.

Можа махнуць на ўсё рукой й супакоіць нэрвы, як піша «Газэта польска», «вясёлым гумарам»? Спэцыяльная студэнцкая газэта «Акадэмічная дэкада» прабуе гэта рабіць і сьмяецца з гумарам вісельніка. «Сьлёзы на вачох» імкнуцца падмяніць сьмехам, звычайным нявінным сьмехам, разьлічаным выклікаць міраж бадзёрасьці і жаданьня жыць... Не ўдаецца. Міраж распаўзаецца, як туман, як дым ад моцнага ветру. Нават «Газэта польска» прымушана была назваць гумар «Акадэмічнай дэкады»...

«... СЬМЕХАМ СКРОЗЬ СЬЛЁЗЫ».

Непакой і трывога пануюць у лягеры фашызму. Фашысцкая прэса са страхам пытае, да чаго прывядзе «нядоля моладзі, у чыіх руках знаходзіцца будучыня народу і дзяржавы»?

Зразумелая трывога! У масах працоўнай інтэлігенцыі Польшчы ўсё мацней расьце ўсьведамленьне, што «сьлёзы на вачох» і «галодную сьмерць» можа зьнішчыць толькі непераможная рэвалюцыйная барацьба пад гегемоніяй пралетарыяту.

Уцільцэх заводу імя Молатава патрабуе аздараўленьня

Адным з першых на Беларусі правёў сваю ініцыятыву ў справе скарыстаньня адкідаў для выробу тавараў шырокага спажываньня менскі дрэваапрацоўчы завод імя Молатава. Ён арганізаваў вялікі ўцільцэх.

З першых дзён працы заводзкія арганізацыі аддавалі цэху нямат увагі, у выніку чаго ліпеньскі і жніўневьскі пляны былі выкананы здавальняюча. У верасьні-ж тэмпы работы значна аслаблі. Плян выканан толькі на 48,5 проц. З прычыны гэтага заданьне трэцяга кварталу не выканана на 15 проц. У першай дэкадзе кастрычніка адставаньне паглыбілася. Дэкадная праграма ажыцьцёўлена ўсяго на 22,4 проц.

Галоўны віноўнік зьніжэньня тэмпаў работы—мэханічнае аддзяленьне, якое не спраўляецца з загатоўкай матар'ялу. Маламоцнасьць фрэзэрнага, адсутнасьць запаснога варштатаў у гэтым аддзяленьні, недахват кваліфікаванай рабочай сілы—значна адбіваюцца на своячасовай загатоўцы дэталяй для іншых аддзяленьняў.

Аб чым гэта сьведчыць? Перш за ўсё аб тым, што кіраўніцтва заводу й заводзкія арганізацыі значна аслабілі ўвагу да ўцільцэху, не мабілізавалі рабочага калектыву на зьнішчэньне прарыву. Цэх рабочай сілай заставаецца незабясьпечаным. Не хапае 30 чалавек, галоўным чынам сталяроў.

Зараз фармальна цэх пераведзен на дзьве зьмены, але гэта толькі на паперы, бо па другой зьмене працуе ўсяго 4-5 чалавек. Такое становішча не дае магчымасьці поўнасьцю скарыстаць і без таго слабае абсталяваньне цэху, а таксама і энэргію.

Дрэнна і няўмела расстаўляецца рабочая сіла. Няма прымацаваньня рабочых да паўных апэрацый. Рабочых штодзенна перакідваюць з адной работы на другую, што параджае абязьліку ў працы. Безгаспадарчасьць і пераспарадчасьць у галіне расстаноўкі сіл вядзе да вялікіх крастоваў. Як правіла, рабочым даецца праца пасьля гудка. Значна адбіваецца на працы цэху і недахват майстраў. Між тым ёсьць рабочыя з вялікім вытворчым стажам, якіх можна вылучыць на пасаду майстраў. Заводзкія арганізацыі гэтым пытаньнем зусім не займаюцца.

Яшчэ горшае становішча з якасьцю прадукцыі. Неакуратны спуск дошак для штафак, слабае замацаваньне ручак у століках і цэлы рад іншых дэфэктаў—усё гэта знак на зьніжае якасьць вырабленых рэчаў.

У цэху вялікая цеснота. Мала таго, што само памяшканьне малое. Нагромаджанасьць паўфабрыкатаў і матар'ялаў у некаторых аддзяленьнях (пяровачнае) значна тармозіць працу і псуе якасьць прадукцыі. Холад і вільгаць у пяроваччным аддзяленьні не дае магчымасьці хутка прасушаць пяроўцы даталяй і яны часта скарыстоўваюцца ў сырым выглядзе. А гэта ня можа не адбіцца на якасьці прадукцыі.

Шмат перашкаджае працы адсутнасьць патрэбнага дапаможнага матар'ялу: петляў для шафаў, цьвікоў і інш. Адчуваецца недахват і інструментаў. Тармозіць працу цэху адсутнасьць належнай колькасьці варштатаў. Рабочым прыходзіцца працаваць проста на сталох.

Няўмелая расстаноўка рабочай сілы і слабая масавая работа сярод рабочых перашкаджаюць арганізацыі брыгадзіраў працы і разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарництва.

Завод імя Молатава павінен мець свой працаздольны ўцільцэх. Заводакіраўніцтва і арганізацыі заводу павінны ўзмацніць сваю ўвагу да гэтага важнейшага вучастку работы заводу. Неабходна прыняць усе меры да таго, каб ня толькі здзявіць тэмпы, якія былі ўзяты спачатку арганізацыі цэху, але і навіць усю запазычанасьць трэцяга кварталу.

А. Фядосцаў.

Лідэр лібэралаў аб аттаўскіх згодах

ЛЁНДАН, 20 (ТАСС). Як паведамляюць з Аттавы, лідэр лібэралаў Мекензі Кінг упёс напраўку да рэзалюцыі прэм'ера, якая катэгарычна асуджае аттаўскія згоды.

Кінг, матывуючы сваю напраўку, заявіў, што імпэрскія згоды маюць тэндэнцыю перапраўць брытанскую імпэрыю ў эканамічнае аб'яднаньне, якое абкладае данінай сусьветны гандаль, і вядуць да страты Канадай яе пазыцый на міжнародным рынку. Што-ж датычыць англа-канадзкай згоды, то паводле слоў Кінга, гэта згода ў 223 выпадках уносіць зьмены ў тарыфныя стаўкі, прычым у 139 выпадках гэтыя зьмены пацягнуць за сабой рэпрэсыўныя меры з боку замежных дзяржаў.

Аналізуючы новый канадзкія мыты на брытанскія імпэрныя тавары, Кінг указаў, што мыты па назначнай колькасьці артыкулаў у даны момант значна вышэйшыя, чым два гады таму назад.

Міністэрства замежных спраў апублікавала паведамленьне, што ангельскі ўрад запрасіў урады Нарвэгіі, Даніі і Швэцыі прыступіць у Лёндане да перагавораў, зьвязаных з пытаньнем аб мытных тарыфах.

Перагаворы будуць весьціся кожнай дзяржавай паасобку і маюць мэтай не перагляд дагавораў, а заключэньне новых згод у рамках існуючых гандлёвых дагавораў.

СПРАВА ФРАНЦУСКІХ ІНТРЫГ

ВЕНА, 20 (ТАСС). Як паведамляюць з Бухарэсту, адстаўка ўраду Вайда-Вайводы пасьлядовала, ня гледзячы на рэзалюцыю ЦК нацыянал-царанісцкай партыі, якая ўхваляе палітыку ўраду. Непасрэднай прычынай адстаўкі зьяўляецца, па думцы палітычных колаў, адмаўленьне караля прадставіць для Вайды-Вайводы свабоду дзеяньняў у галіне замежнай палітыкі і, у прыватнасьці, у перагаворах з Савецкім саюзам аб заключэньні пакту аб ненападзе.

Лёс ураду Вайда-Вайводы капчаткова вырашыўся ў рэзультаце інтрыг **французскіх ваенных колаў** цяжкай прамысловасьці, рупарам якіх зьяўляецца Тытулеску, выступіўшы супроць лініі замежнай палітыкі ўраду.

Катастрафічнае фінансавае становішча, якое абвастрылася ў рэзультаце правалу фінансавых перагавораў у Жэнэве, зьяўляецца таксама адным з важнейшых фактараў, выклікаўшых падзеньне ўраду.

Урад дарэмна стараўся дабіцца частковага мараторыя па замежных даўгох французскім і ангельскім крэдыторам. Фінансавае становішча Румыніі ўзмацніла ўцечку капіталаў. Курс румынскай валюты за апошні дні зьменшыўся з 12 да 2. У румынскіх палітычных і эканамічных колах пануе поўная дэзарыентаванасьць наконт выхаду са створанага становішча, прычым падкрэсьліваецца, што вырашэньне ўсіх гэтых фінансавых пытаньняў знаходзіцца ў простай залежнасьці ад адносін **уплывовых замежных фінансавых колаў да зьнешня-палітычнай лініі румынскага ўраду.**

АДКАЗ ЯПОНІІ НА ДАКЛАД ЛІТОНА

ТОКІЁ, 20 (ТАСС). У міністэрстве замежных спраў учарне закончаны пярэчаньні супроць дакладу Літона, якія будуць складзены ў форме мэмарандуму, які выкладае пункт погляду Японіі. Японія ня высоўвае контрпрапановаў для вырашэньня манчжурскага пытаньня, лічачы яго **вычарпальным** прызнаньнем Манчжурскай дзяржавы.

УХОД ГЕНДЭРСОНА

ЛЁНДАН, 20 (ТАСС). Гендэрсон адмовіўся ад пасады кіраўніка лейбарысцкай партыі. У палітычных колах адмаўленьне Гендэрсона тлумачыцца, як рэзультат паражэньняў, нанесеных ім па канфэрэнцыі лейбарыстаў у Лейстэры.

БАРАЦЬБА АНГЕЛЬСКІХ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ЛЁНДАН, 20 (ТАСС). 19 кастрычніка калёны беспрацоўных дэманстрантаў з усіх канцоў Лёндану накіраваліся да будынку савету лёндонскага графства, патрабуючы павялічэньня дапамог. Чатыры тысячы чалавек ішлі з усходняга раёну, тысяча з Кемберуэла і шмат тысяч з заходняга і паўночнага раёнаў.

Звыш 2.000 чалавек паліцыі і спэцыяльныя атрады паліцэйскіх на аўтамабілях былі мабілізаваны, каб разагнаць дэманстрантаў. Паліцыя некалькі раз атакавала беспрацоўных. Дэманстранты супраціўляліся і зноў строіліся ў рады, працягваючы дэманстрацыю. Тысячы людзей зноў атакоўваліся конная паліцыяй. Дэманстранты закідвалі паліцыю каменьнямі і бутэлькамі. Паліцыі ўдалося ўрэшце разагнаць дэманстрантаў. Беспрацоўныя тады пашлі да будынку лёндонскага графства адзінкамі.

Тысячы беспрацоўных сабраліся перад будынкам савету, які ахоўваўся пешай і конай паліцыяй. Тут зноў паўтарыліся паліцэйскія атакі. Паліцэйскія грузавікі на поўным ходу ўрэзаліся ў натоўп. Частка натоўпу адступіла ў кватэры рабочых. Жыхары разам з беспрацоўнымі, абараняючыся, кідалі ў паліцэйскіх бутэлькі і начыньне.

Савет лёндонскага графства, які засядаў пад аховай вялікіх атрадаў паліцыі, адмовіўся прыняць дэпутацыю. Пазьней савет пачаў перагаворы з дэпутацыяй на 24 кастрычніка. Тымчасам вулічныя баі працягваліся да паўночы. Арыштавана 32 чал. Многія паранены, сярод іх некалькі дзесяткаў паліцэйскіх.

* *

ЛЁНДАН, 19 (ТАСС). Атрад галоднага паходу з паўночна-заходняга раёну дасягнуў байсковай паветранай базы ў Грэнтхэме. Удзельнікі паходу прышлі на аэрадром і пачалі збор сродкаў сярод салдат аэрадрому. Афіцэры з дапамогай паліцыі разагналі беспрацоўных, якія пакінулі аэрадром з пяньнем рэвалюцыйных песьняў. Потым у паветра падняўся самалёт, з якога былі скінуты сабраныя для беспрацоўных грошы.

149.000 ЗАБАСТОЎШЧЫКАЎ
КЛЯСАВЫЯ БАІ ПОЛЬСКІХ ПРАЛЕТАРАЎ

ВАРШАВА, 18. Толькі цяпер апублікаваны даныя аб забастоўках, якія адбыліся ў Польшчы за пярыяд з 1 студзеня па 1 сакавіка бягучага году. Апублікаваныя даныя ярка сьведчаць аб няўхільным нарастаньні забастовачнай барацьбы польскага пралетарыяту.

За першы квартал 1932 г. у Польшчы адбыліся 94 забастоўкі — на 45 проц. больш параўнальна з адпаведным пэрыядам мінулага году. Забастоўкі былі праведзены ка 809 заводах і фабрыках. У мінулым годзе ў першым квартале забастоўкамі было ахоплена толькі 188 прадпрыемстваў. Параўнальна з першым кварталам 1931 г. колькасьць бастуючых рабочых павялічылася на 134.000 чалавек і дасягнула 149.000.

53 забастоўкі з 94-х скончыліся поўнай і частковай перамогай бастуючых.

* *

ВАРШАВА. За апошнія дні ў Польшчы меў месца рад рэвалюцыйных выступленьняў.

Рабочыя фабрыкі Дытля ў Сасновіцах на патрабаваньне дырэкцыі аб зьніжэньні зарплаты на 15 проц. адказалі італьянскай забастоўкай і заняли фабрыку. Спроба паліцыі вызваліць фабрыку скончылася няўдачай.

У Вялікай Дамброўцы (Дамброўскі басэйн) адбылася дэманстрацыя звыш 1.000 беспрацоўных. Беспрацоўныя патрабавалі выдачы бон на хлеб. Яны былі атакаваны моцнымі атрадамі паліцэйскіх. У сутычцы, якая адбылася, паранена шмат рабочых.

Яшчэ больш вострыя сутычкі мелі месца ў Лодзі перад фабрыкай Герэнбэрга і Гальбенштадта.

У радзе галін прамысловасьці праводзяцца далейшыя значныя скарачэньні рабочых. Патушана домна на «Гуце Банковай» у Верхняй Сілезіі. Звольнены ўсе рабочыя цагелень у Чэнстахове ў сувязі з поўным спыненьнем будаўніцтва і г. д.

* *

ВАРШАВА. Услед за Зах. Украінай і Зах. Беларусіяй робяцца частымі сутычкі сялян з уладамі і ў карэннай Польшчы.

Некалькі дзён назад у Келецкім павеце адбыліся крывавыя баі паміж сялянамі і паліцыяй, якая перапакаджала парубцы лесу. Сяляне прабавалі адбіць двух сялян, братоў Маравецкіх, арыштаваных у лесе. Паліцыя страляла і забіла аднаго з арыштаваных Пятра Маравецкага. У адказ на гэта сяляне ўдарылі ў звон і вялізарнай масай кінуліся на паліцэйскіх, атакуючы іх каменьнямі. Адбылося крывавае пабоішча, у часе якога паліцэйскія забілі яшчэ двух сялян—Фурманка і Экерта, і многіх цяжка паранілі. Аднак сяляне працягвалі атаку і адбілі арыштаванага Яна Маравецкага.

* *

ЛЬВОЎ. У Львове паліцыя зрабіла налёт на украінскі студэнцкі дом. Налёт гэты, паводле слоў «Ілюстраванага кур'ера дзённага», зьвязан з нападам на ахову вайсковага арсэналу 19 пяхотнага палка.

У часе вобыску, паводле слоў тэй-жа газэты, знойдзена нелегальная друкарня, вялікая колькасьць нелегальнай літаратуры і г. д. Паліцыя арыштавала ўсіх жыхароў студэнцкага дому (150 чал.).

* *

ВАРШАВА. На капальні «Віктор» у Міловіцах (Дамброўскі басэйн) адбыўся шматлюдны мітынг гарнякоў, на якім выступіў камуністычны дэпутат Рожэк.

Тав. Рожэк гаварыў аб надыходзячай гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі і адзначаў гігантскія дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім саюзе. Паліцыя перарвала выступленьне Рожэка і жорстка зьбіла яго.

Польскія паліцэйскія ўлады зноў робяць масавыя вобыскі і арышты сярод рабочых і інтэлігентаў, западазроных у «камуністычнай дзейнасьці». Гэтымі днямі арыштавана 14 студэнтаў варшаўскага ўнівэрсытэту, якія абвінавачваюцца ва ўдзеле ў «работах рэдакцыйнай камісіі кампартыі». У Саснаўцы паліцыя арыштавала чатырох рабочых-гарнякоў капальні «Рэвар».

Арыштаваныя абвінавачваюцца ў «прыналежнасьці да МОПР'у і кампартыі».

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

МАСКВА, 20 (ТАСС). Ковенскі карэспандэнт ангельскага агенцтва «Эксчэнж тэлеграф» паведамляе, што «Саўнарком СССР прыняў пастанову прапанаваць ураду Англіі перагледзець англа-савецкі гандлёвы дагавор».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленьне названага карэспандэнта **пазбаўлена ўсякай падставы.** Ні Саўнарком СССР ні які-небудзь інны орган ураду СССР ня ўзбуджаў пытаньня аб зьмене, перагляде або дэнансаваньні часовага гандлёвага дагавору з Англіяй.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што дэнансаваньне часовага гандлёвага дагавору з Англіяй зроблена на ініцыятыве і за поўнай адказнасьцю аднаго толькі ангельскага ўраду.

* *

ЛЁНДАН, 20 (ТАСС). У адказ на ноту міністра замежных спраў Сваймона аб дэнансаваньні англа-савецкай гандлёвай згоды, пераданы ў справах СССР пацьвердзіў атрыманьне ноты і паведаміў, што яе зьмест даведзен да ведама ўраду Савецкага саюзу.

Аб злачыннай дзейнасьці менскай транспартнай арцелі „Чырвоны транспартнік"

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК КП(б)Б—КАЛЕГІІ НК РСІ БССР АД 13 ВЕРАСЬНЯ 1932 г.

Лічыць устаноўленым, што дзейнасьць арцелі «Чырвоны транспартнік» ня мае нічога агульнага з прынцыпамі і задачамі работы савецкай каапэрацыйнай арцелі і аб'ектыўна была накіравана на зрыў мерапрыемстваў ураду па зьніжэньні кошту транспартных паслуг. З прычыны адсутнасьці патрэбнага кіраўніцтва з боку ВСПС і Менскага РСПО, належнага кантролю з боку фінорганаў, скажэньня клясавай лініі і хвасьцісцкіх паводзін кіраўнікоў арцелі — камуністаў **Капланскага А. Р.** і **Кубрынскага В. А.**, арцель возчыкаў, скарыстоўваючы сваё каапэрацыйнае становішча і канъюнктуру, праяўляла абураючыя рвацкія дзеяньні, бяручы спэкулянцкія стаўкі за перавозкі, ў 2½ разы перавышаючыя стаўкі працуючага ў аднолькавых умовах дзяржаўнага транспарту і нават перавышаючыя па сынучых грузах цэны прыватнага гужтранспарту.

Выходзячы з гэтага, кіруючыся пастановай СНК БССР ад 14 ліпеня 1932 г., ЦКК НК РСІ пастанаўляе:

1. **Аддаць пад суд праўленьне менскай арцелі «Чырвоны транспартнік».** Прапанаваць менскаму пракурору закончыць следзтва ў тэрміновым парадку, прыцягнуўшы да судовай адказнасьці таксама тых цэхавых групаводаў, у адносінах якіх будзе ўстаноўлена парушэньне афіцыяльна існаваўшай у арцелі калькуляцыі пры заключэньні імі зьдзелак за перавозкі грузаў. Справу аб антыпартыйных паводзінах кіраўнікоў арцелі **Капланскага** і **Кубрынскага**—перадаць партколегіі ЦКК для прыцягненьня іх да суровай партадказнасьці.

ПК разгледзець гэтую справу пасьля суду.

2. Праўленьню менскага **райсампрамсаюзу**, не забясьпечыўшаму патрэбным кіраўніцтвам работу арцелі, абвясьціць вымову.

3. Указаць **Белсампрамсавету** на зусім нездавальняючае з яго боку кіраўніцтва дзейнасьцю сыстэмы ў гэтай галіне. Прапанаваць Белсампрамсавету пад адказнасьць тав. **Брыскіна:**

а) у месячны тэрмін правесьці з удзелам НКФ праверку ўсіх транспартных каапэрацыйных арцеляй, прымаючы рашучыя меры па выкараненьні ў іх рабоце ненармальнасьцяй і па ўзмацненьні кіраўніцтва работай гэтых арцеляй;

б) неадкладна правесьці чыстку арцеляй «Чырвоны транспартнік» і забясьпечыць неадкладную рэалізацыю дырэктывы СНК ад 14 ліпеня аб зьніжэньні кошту транспартных паслуг.

4. Прапанаваць **Галоўдартрансу,** у адпаведнасьці з пастановай СНК БССР ад 5 верасьня 1932 году, неадкладна разгарнуць работу па рэгуляваньні работы гужтранспарту.

5. Пастанову гэту апублікаваць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б —
нарком РСІ БССР
ЛЫЧОЎ.

Забыты вучастак

Культабслугоўваньне рабочых — важнейшы вучастак барацьбы за прамфінплян па цэлым радзе нашых прадпрыемстваў, пушча ма на самацёк.

Культсэктары заўкому і цэхкомаў віцебскага заводу **«Чырвоны кзталіст»** бязьдзейнічаюць. Ужо забыт той час, калі складаўся культсавет заўкому. Пляну культработы няма.

Ні ў адным цэху ня ўбачыш лёзунгаў, плякатаў, чорных і чырвоных дошак, якія б мабілізоўвалі рабочых на выкананьне вытворчых заданьняў.

Культсэктары зусім ня цікавяцца выпускай і чытаньнем газэт рабочымі. Калі ў жніўні газэт і часопісяй выпісвалася на 1.400 руб., то сёньня гэта лічба скацілася да 250 руб. У **зборачным** цэху газэты зусім ня выпісваюцца.

Аналёгічнае становішча з цэхавымі бібліятэкамі-перасоўкамі. Кнігі ў шафах заляжаліся, запляснелі. Аб такіх формах культабслугоўваньня рабочых, як калектыўнае наведваньне кіно і тэатраў, і гаварыць ня прыходзіцца. Гэтага на заводзе няма.

Апартуністычная бязьдзейнасьць культсэктару заўкому адбілася і на ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. З 51 малапісьменных і 15 няпісьменных лікпункт і школу наведвае ўсяго 15-18 чалавек, і то перэгулярна.

Тэхпрапаганда на заводзе ў занядбане. Лекцыі і гутаркі па аўладаньні тэхнікай вытворчасьці ў цэхах не праводзяцца.

Гараджкі клюб мэталістаў мае ўсе ўмовы для ўзорнага культабслугоўваньня рабочых «Чырвонага мэталіста», але ў выніку слабай работы клюбу і бязьдзейнасьці культсэктару заўкому, **клюб заўсёды пустуе.** Апошні не паварушуўся тварам да вытворчасьці, ня стаў змагаром за ліквідацыю прарыву, у якім апынуўся завод «Чырвоны мэталіст».

Старшыня культсэктару заўкому Плавінскі знаходзіцца ў палене адсталых хвасьцісцкіх настрояў. «Чаго я пайду ў цэх, калі там такія трущасьці», — так разважае Плавінскі.

З такім становішчам мірыцца ні ў якім разе нельга. Партколектыў і заўком заводу павінны прыняць рашучыя меры да ажыўленьня работы на гэтым важнейшым вучастку. Указаньне тав. **Сталіна** аб паляпшэньні культабслугоўваньня рабочых павінна быць няўхільна ажыцьцёўлена.

А. Зарубежны, М. Узьдзін.

ЗАБАРОНА ДЭМАНСТРАЦЫЙ

ВЕНА, 20 (ТАСС). Лідэр фашысцкіх хэймвераў маёр Фэй прызначан статс-сакратаром па справах дзяржаўнай бясьпечнасьці. У сувязі з крывавымі сутычкамі паміж нацыянал-сацыялістамі і рабочымі, новы статс-сакратар выдаў распараджэньне аб забароне вулічных дэманстрацый.

У інтэрв'ю з прадстаўнікамі друку Фэй паведаміў «аб намеры ўраду самымі рашучымі мерамі змагацца супроць тэндэнцый, якія разьвальваюць дзяржаву і разбураюць гаспадарку». Хрысьціянска-сацыяльная «Райхспост» паведамляе аб тым, што мяркуецца выданьне надзвычайных дэкрэтаў на аснове закону «аб выключным становішчы».

«Ротэ фанэ» патрабуе масавых выступленьняў з мэтай дабіцца вызваленьня арыштаваных рабочых членаў шуцбунду, роспуску і раззбраеньня дэманстрацый.

Нумар «Ротэ фанэ» канфіскаваны.

ЧАРГОВАЯ РАСПРАВА З „РОТЭ ФАНЭ"

БЭРЛІН, 20 (ТАСС). Палітычная паліцыя апячатала друкарню «Ротэ фанэ» і ўсе машыны. Гэта мерапрыемства матывуецца тым, што ў друкарні «Ротэ фанэ» друкаваліся быццам выданьні, якія канфіскаваны за іх «антыдзяржаўны характар».

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ НАД КАЗАРМАЙ

ПАРЫЖ, 18. «Юманіта» зьмяшчае цэлы рад матар'ялаў, якія сьведчаць аб росьце рэвалюцыйных хваляваньняў сярод салдат францускай арміі. У радзе месц арганізуюцца салдацкія антываеннія дэманстрацыі з адкрытымі выступленьнямі супроць інтэрвэнцыяністкай палітыкі францускага імпэрыялізму.

У прыватнасьці масавая дэманстрацыя была арганізавана адпускнікамі тэрміну службы 1930 г. Пасьля ранейшых шматлікіх дэманстрацый, якія адбыліся ў ваенных лягерах Карп'ян, Майі і Сьсон, салдаты-адпускнікі пры ад'езьдзе дамоў зноў дэманстравалі, ня гледзячы на ўсе рэпрэсыўныя меры, прынятыя афіцэрамі.

Салдаты 146 палка ў Мэцы вывесілі на сьценах казармы лёзунгі «Няхай жыве СССР, далоў імпэрыялістычную вайну».

7 кастрычніка на ваенным фарту Мэзэль над казармай 3-га батальёну ўзьвіўся чырвоны сьцяг, упрыгожаны серпам і молатам.

КУЛІ ЗАМЕСТ ХЛЕБА

ЛЁНДАН, 19. (ТАСС). Па ўсёй Англіі працягваюцца дэманстрацыі беспрацоўных, патрабуючых скасаваньня «праверкі патрэбнасьці» і спыненьня «рэжыму эканоміі». Патрабаваньні рабочых зводзяцца—таксама да аказаньня і выплаты спэцыяльнай дапамогі на зіму, прадастаўленьня вугалю, абутку і вопраткі для дзяцей беспрацоўных і г. д. Рад дэманстрацый адбыўся ў Шэфілдзі. Вялікія дэманстрацыі беспрацоўных адбыліся ў Эдынбургу. 2.000 беспрацоўных дэманстравалі ў Бэлфасьце.

Удзельнікі галоднага паходу па Лёндан сустракаюць на сваім шляху цёплае падтрыманьне з боку рабочых. У часе прахаджэньня праз Бэльфаст атрады былі сустрэты воклічамі: «Змагацца ці памерці!». Рэфармісцкія прафсаюзныя бюракраты прабуюць перашкодзіць паходу. У Нью Арку яны выклікалі паліцыю, каб расьсеяць удзельнікаў галоднага паходу, якія зьвярнуліся ў прафсаюз за дапамогай.

Паведамленьні

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Фенчанка Данілы Іванавіча (Койданаўскай арц.) зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б або паведаміць свой адрас, месца жыхарства і работы—Менск, Савецкая, 55, 3-ці паверх, 18 пакой. Просьба да ўсіх партарганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёнага таварыша, паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

— 22-X-г. г., у 6 гадз. веч., у памяшканьні партколегіі ЦКК КП(б)Б адбудзецца нарада па пытаньні ўдзелу грамадзкіх партсьпецтваў у працы партколегіі. На нараду выклікаюцца на ступіньні т. т.: Гітліц М. М. (газ. «Бальшавік»), Эльцерыя Х. М. (Гарфа), Рэвіс (ЦВК), Гусьеў І. А. (Дзяржплан), Жалезьняк Я. В. (Хеба-завод), Цітовіч В. Т. (СНК), Безбародаў (Наркамснаб), Голіад Р. А. (Галаўмілітэр), Пашкіна В. В. (Наркампрацы), Улазаў І. А. (Дом Камасьветы), Майзіт Г. І. (НВК), Вапілава Э. А. (НКФ), Казьляк С. Г. (Бежаўгастрэст), Патрук А. З. (Дэпо МБВ чыг.), Ашык (Нарсувязь), Фрыдман (друк. імя Сталіна), Панкоў А. А. (ВСНГБ), Чэрнецкі Н. А. (Лесбел), Шэйман Р. (ф-ка 8 сакавіка). Прысутнасьць абавязкова.

— 22-X-г. г., у 7 гадз. веч., у памяшканьні клюба Р. Люксэмбург (вул. Карла Маркса) адбудзецца агульны сход намольшчыкаў — членаў КП(б)Б Менскай арганізацыі з наступным парадкам дня: 1) Аб рабоце бюро Бел. аддзяленьня т-ва старых бальшавікоў за час пасьля канфэрэнцыі. Дакл. т. Бялцін. 2) Пляны работы аддзяленьня на IV квартал: а) на агіт масавым і культ. быт. сэктары. Дакл. т. Сьвар дзова; б) па арганізацыйным сэктары — т. Окаўрэнаў; в) на гаспадарча-бытав. сэктары—т. Дамброўскі. 3) Разгляд і зацьвярджэньне кантрысу Бел. аддзяленьня т-ва старых бальшавікоў на 1933 г. Яўка ўсіх пазольшчыкаў—членаў КП(б)Б Менскай арганізацыі са стажам да 1916 г. уключна абавязкова.

— Інстытут масавага заочнага навучаньня партактыву пры ПК КП(б)Б склікае нараду раёнарганізатараў па масавым заочным навучаньні. Нарада адбудзецца ў Доме Камасьветы (рэст. Энгельса і Карла Маркса) і пачне сваю працу з 25 кастрычніка. Парадак дня: 1) Чарговыя задачы партыйна-выхаўчай работы —т. Ягораў. 2) Дакład інстытуту аб вынніках навучальнага году і аб пляны рыхтоўцы да новага навучальнага году—тав. Эйнштэйн. Суадклад Гомельскай ЗОПШ. 3) Аб рабоце кансультацыйных пунктаў — т. Любін. Суадклад Камавацкага раёнарганізатара. 4) Аб арганізацыі радыё-вяшчаньня і радыё-слуханьня. Тав. Жукаў. Суадклад Полацкага раёнарганізатара. 5) Аб асьцяным набо ры ў сыстэму заводскага партнавучаньня — т. Лебедзеў. 6) Аб заключных і пучэбных канферэнцыях—т. Малаковіч. 7) Аб вучэбных плянах на 1933 год—т. Малаковіч. 8) Аб камсамольскім унівэрсытэце—т. Любін. На нараду павінны зьявіцца раёнарганізатары з усіх раёнаў БССР.

Разьвёрстка камплектаваньня менскай Усебеларускай двухгадовай саўпартшколы

Партколектывы г. Менску: зав. імя Варашылава—3 чал., «Бальшавік»—4 чал., імя Молатава—2 чал., «Полымя рэвалюцыі»—2, абутковая фабрыка—4, друкарня імя Сталіна—3, хлебазавод—2, «Камунарка»—2, Белдзяржбуд—2, Цэта—2, Сувязь—2, «Кастрычнік»—5, «Камунар»—2, пчотачная—2, МРВ—2.

Астатнія п/к і яч. КП(б)Б, за выключэньнем навучальных устаноў, адбіраюць і камандыруюць па адным таварышу. Увесь матар'ял згодна правіл прыёму ў Менскую СПШ (гл. «Зьвязду» ад 4/X-1932 г. і «Рабочай» ад 9-X-1932 г.).

Культпроп ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ
ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ
(МЕНСК, ПЕРШАМАЙСКАЯ ВУЛ. ДОМ № 7)
шукае наступных грамадзян,
якім належыць з Амэрыкі страхоўка, пэнсія і іншыя віды ўзнагароды пасьля памёршых там іх родных:

Барон Яўдокія—маці Барон Давіда.
Марчына Ганна—маці Марчына Пятра
Фрэдэрэкс Марь'я—маці Фрэдэрэкс Антонія (Джона).
Сястра Сакалоўскага Якава.
Козак (Ковачук) Сьцепаніда — жонка Козака Алекса.
Ганна Файнбэрг—жонка Будове Натана.
Блох Эстэр-Іта—маці Блоха Ісаака.
Батасковы Эстэр і Іосіф—бацькі Баткова Джона.
Шышэскія Фэлікс, Ганна і Вэроніка—бацька і сёстры Шышэскага Стэнлі.
Бацька Хомова (Гомава) Саламона.
Кандрацюкова Аляксандра—сястра Федорук Франца.
Брат і сястра Шчэрбінскага Віктара.
Родныя Келікс Майка.
Мічнік Петр—бацька Мічніка Тома.
Кац-Рывен Ганна—жонка Рывен Томаса.
Фінарскія Давід і Шэйндле—бацькі Фінарскага Іосіфа.
Бацькі Кайнскага Лаўрэнса.
Сумунская Генрыетта—сястра Катлоўскага Ф. Е.
Мількенэ Рахіль — жонка Мількенэ Юліўса.
Гордэйкер Рахіль — маці Гордона Самуіла.
Рысец Фэлікс—брат Рысец Джона.
Горобец Ксенія Тодараўна—маці Горобец Юфрана.
Жонка і дзіця Дудака Пятра.
Шыпц Афроім—бацька Шыпца Веньяміна.
Сосонкін Шолом—бацька Сосонкіна Ісідора.
Арлова Яўгенія—сястра Арлова Мікалая.
Драганцэвіч Елізавета—маці Драганцэвіч Вальтэра.
Шэрман Мар'я—маці Шэрман Эліса.
Маці Мельнікава Джона (Івана).
Скрыпніцкая Мілла-Ноя—маці ці жонка Скрыпнік-Скравіч Ігната.
Нагорная Мар'я—маці Нагорнага Васса.
Гурвіч Ісаак—бацька Гурвіча Луі.
Боярскі Ісаак—бацька Боярскага Джо.
Бордэн Ульяна—жонка Бордэна Міхаіла.
Зеліцкая Мэндель і Поля—бацькі Зеліцкага Натана.
Маці Дзікоўскага Вальтэра.
Мэндэлевіч Вольф (Валке)—бацька Мендэлеевіча Абрама.
Бацькі ці інш. родныя Ганафф Георга.
Рамарскі Антон—бацька Рамарскага Антонія.
Родныя Косінскага Іно Цысьлэра.
Бацькі Апштэйна Сэма.
Бацькі Фэйна Хаймана.
Родныя Белярскага Юліяна.
Бацькі ці інш. родныя Гласс Лявона.
Дубаневіч Мальвіна—сястра Дубаневіча Вальтэра.
Мельнічук Карп — бацька Мельнічук Сямёна.
Сігель Іосіф—бацька Сігела Морыса.
Бэркоўская Мар'я сястра Бэркоўскага Франка.
Бацькі Заккер Хрысьціяна.
Сястра Лессэр Самуіла Н.
Ворон Марыя, Аляксандр, Казімір, Сьцяфан, Вацлаў і Станіслаў—маці, браты і сёстры Ворона Джона (Івана)
Пенскальская Софія—жонка Пенскальскага Іосіфа.
Бацька Бэрковіча Іосіфа.
Шарры Марыя і Рыгор—бацькі Шарры Самуіла.
Грудзінская (Брудзінская) Лея-Кадзя—жонка Брудзінскага Франка.
Келлес Тэўба—маці Келлес Абрама.
Плямяннікі—Стэйна Самуіла (Штэйн).
Лейба Рэфф—бацька Рэфф Ісака.
Бацькі Сулівон Джо.
Даніл Туровіч—бацька Туровіч Джона Д.
Тоба Новапрутская сястра Новапрутскага Ізраіля.
Бацькі Копата Тоні.
Сілінік Анна—маці Сілінік Вільяма.
Сям'я Баравік Абрама.
Маці Лашынскага Бэна.
Дымкоўскі Ал-др.
Ільлінскі Ал-др.
Калінoўскі Віктар Іванаў.
Ідэлевіч Мар'я Хаімаўна і Мордхе-Лейзер.

УВАГА: Трэба ведаць, што прозьвішчы з Амэрыкі часта даюцца перабліытанымі пры перакладзе з ангельскай на расійскую мову.

22 кастрычніка, у 6 гадз. веч., у клюбе друкароў (Ленінскай № 13)
скліканецца
2-я Менская ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ШЭФТАВАРЫСТВА
Дэлегаты выбіраюцца шэф. кустамі. Модус—1 ад 10 членаў т-ва.
Мандаты ў гар. шэф. т-ва (Ленінская № 5) штодзённа ад 10 гадз. ранцы да 2 гадз. дня і ад 5 да 7 гадзін вечара.
Фракцыя канфэрэнцыі 22-X у 5 гадзін вечара там-жа
Просьба да дэлегатаў не спазьніцца, каб не затрымаць работу канфэрэнцыі, якая разьлічана на адзін вечар.
АРГКАМІСІЯ.

25 кастрычніка, у 6 гадз. вечара, у г. Менску,
у памяшканьні Дому тэхнікі, Камсамольская, 25,
СКЛІКАЕЦЦА
ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА
тэхпропаў заводаў і аб'яднаньняў кіраўніцтва ўпаўнаважанага Наркамцяжпраму СССР пры СНК БССР.
На нараду запрашаюцца рабочыя і інжынэрна-тэхнічныя работнікі заводаў г. Менску.
Рэгістрацыя ўдзельнікаў нарады ў кіраўніцтве ўпаўнаважанага НКЦП (чырвонаармейская, 16, 1-шы паверх, сэктар тэхпропу).
Сэктар тэхпрапагэнды.

У аддзел аб'яў звяніце па тэлефону № 7-81

—„Як гэта перакласьці?"
—запыталася дзяўчына
у гукавой мастацкай карціне
СПРАВЫ і ЛЮДЗІ

Друкарні „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБНЫ
БУХГАЛЬТАР і РАХУНКАВОД
Зварачацца: Савецкая, 61, 2-ці паверх.
Кантора выдавецтва „Зьвязда".

„Чырвоная Зорка" Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30. Каса—за 1 г.
Гукавы мастацкі фільм БУДЗЕМ ГАТОВЫ
Інтэрнацыянал
ЗМОВА МЕРЦЬВЯКОЎ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
ПУСК ДНЕПРАГРЭСУ
Пралетары
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
Мядзьвежая даліна
Дзённыя дзіцячыя сэансы
Мастацкі фільм ЦАЦКІ

Кіно „СПАРТАК".
Ад 21 кастрычніка выдатны фільм
ПРАСТЫТУТКА драма у 7 ч.
ШТОДЗЕННА 4 сэансы.
Пачатак 1-га—7 г., 2-га—3 г. 10 м., III-га 9 г. 20 м. IV-га—10 г. 40 м.
КАСА з 5 г. Каса кіно—з Камсамольск. вул.

Цэнтральны Дом Тэхнікі ЦК ЛКСМБ
(Камсамольская, 25)
даводзіць да ведама, што 22-га кастрычніка 1932 г. у 9 гадз. веч., адбудзецца
ЛЕКЦЫЯ інжынэра Краскашчокава, якая арганізуецца Домам Вучоных
НА ТЭМУ:
„Новыя важучыя матар'ялы"
Запрашаюцца: вытворчыя антыў. ПР будаўнічых арганізацый, студэнты будаўнічага інстытуту і тэхнікуму.
Дырэкцыя Дому Тэхнікі.

Беларускаму гэадэзычнаму кіраўніцтву
ПАТРЭБНЫ
працаўнікі, пакаленьні скончыўшым 7 клясы, для працы на раёне па заняладзе цэнтраў пад трыгаванометрычнымі пунктамі (маякамі) у якасьці адказных за работу.
Аплата па згодзе. На час работы выдаецца абед і спэцпропратка. Работы будуць вытвярацца па 1-XII—г. г.
Па сканчэньні работы жадаючым могуць быць накіраваны на курсы дзесяцімесячнага будаўніцтва маякоў.
— За ўсімі даведкамі зварачацца: — Менск, Чырвонаармейская, 16, Беларускае гэадэзычнае кіраўніцтва, да т. Зайцаву.

Менск, друкарня «Зьвязды»